ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -здатку.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЬ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

НЯДЗЕЛЯ 8 чэрвеня 1930 г.
№ 132 (3730)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

ВЫШЭЙ ТЭМПЫ СЯЎБЫ!

Аб 100% выкананьні сяўбы тэхкультур павінна рапартаваць БССР XVI зьезду УсеКП(б)

Ударнай работай у гэтыя апошнія рашаючыя дні, пасьпяхова завершым бальшавіцкую пасеўную кампанію

Рашучыя дні

Мы ня раз канстатавалі, што тэмпы сяўбы нездавальняючыя, што існуе рэальная нагроза зацяжкі кампаніі. Весткі па 1-га чэрвеня не гавораць аб зруху. Лён, канопілі і іншыя тэхнічныя культуры—усё яшчэ найбольш слабыя паражальныя вучасткі пасеўнага фронту.

На 1 чэрвеня засеяна 1.740.247 гэктараў, што складае 74,6 проц. пасеўнага пляну. Гэта на 11,3 проц. больш, чым на 25 мая. Мінулыя пяцідзёўкі давалі ў сярэднім 10-11 проц. пляну. Такім чынам, тэмп сяўбы і ў апошнія пяць дзён застаўся стабільным.

БССР трэба яшчэ засеяць 25 проц. ўсяго пляну. Між тым, у нас засталася літаральна лічаныя дні. Дзеля таго, каб сваячасова, бяз усякіх зацяжак, з посьпехам завяршыць кампанію, трэба ў што-б ні стала узмацніць тэмпы сяўбы.

Трэба адзначыць трывожны факт. Найбольш паўдзёвая ў БССР акруга—Мазырская, якая пачала сеяць значна раней ад іншых, у апошні час фактычна топчацца па месцы. За апошнія пяцідзёўкі процант засеянай у акрузе плошчы павялічыўся зусім нязначна. На 1-га чэрвеня выканана 74,3 проц. пляну супроць 67,7 проц. на 25-га мая.

Зьвернемся зараз да аналізу сяўбы па асобных культурах. У першую чаргу трэба падкрэсьліць, што ні па адной культуры пасеўныя пляны яшчэ ня выкананы. Калі збожжавымі культурамі па абодвых сэктарах засеяна 77,3 проц., дык значна горш з тэхнічнымі. На ільне выканана 55,8 проц., а на канаплях, нават, 26,4 проц. Калгасы па гэтых культурах усё яшчэ адстаюць ад індывідуальнага сэктару.

Вядома якое вялікае значэньне для ўсяе народнае гаспадаркі БССР маюць лён, канопілі і інш. тэхнічныя культуры. Прыпамянем толькі, што на долю БССР прыпадае 8 проц. усёй Саюзнай пасеўнай плошчы ільну.

Ня гледзячы на гэта, на месцах ня зьвяшчана да гэтага часу недаацэнка гэтага важнейшага вучастку пасеўнага фронту.

Надзвычай слабы ход сяўбы і кантрактацыі ільну (толькі 30 проц.) трэба адносіць, галоўным чынам, за кошт бязьдзейнасьці і нядбайнасьці мясцовых арганізацый. Умовы для сяўбы ільну аднолькавыя ў розных акругах рэспублікі, а вынікі сяўбы вельмі стракатыя і ў паяўнасьці вялікія нажніцы паміж паасобнымі акругамі.

Пасеўшчыкам ільну і тэхнічных культур урадам даны рад буйных ільгот і пераваг. Шырокая папулярызацыя гэтых ільгот павінна была моцна стымуляваць пасеўшчыкаў ільну. Адначас, дасюль паведамляюць з раду раёнаў, што калгасам і бедняком і серадняком індывідуальнікам ільготы не вядомы.

У сёпешнім нумары нашай газэты друкуецца пастанова Саўнаркому БССР аб тэхнічных культурах. Адзначаючы нездавальняючы ход кампаніі, Саўнарком паказвае, што «акруговымі і раённымі выканаўчымі камітэтамі, асабліва Віцебскім, Полацкім і Аршанскім ня ўжыты выстарчальныя меры для выкананьня пляну». Адначасова з гэтым вызначаецца рад канкрэтных мер. Галоўнейшая з іх—выдача па 10 руб. мануфактуры за кожны закантрактаваны гэктар ільну і канапель. Гэта распараджэньне ўраду, павялічваючы ў два разы нормы забесьпячэньня кантрактантаў дэфіцытнай мануфактурай, можа зрабіць вялікі ўплыў на далейшы ход кантрактацыі і сяўбы тэхкультур, зразумела, пры ўмове неадкладнай папулярызацыі іх сярод шырокіх пластоў бяднякоў-серадняцкіх мас.

Сям-там па мясцох зьявіліся зараз дэмабілізацыйныя настроі. Ужо засеяна, моў, значная частка пасеўнай плошчы, можна паслабіць напружанасьць на засеўным фронце—разважаюць некаторыя работнікі. Такім дэмабілізацыйным настроям трэба неадкладна даць самы рэзкі і рашучы адпор. Засеўная кампанія ня толькі ня скончана, але, наадварот, уступіла ў самы рашаючы і адказнейшы пэрыяд.

Мы павінны намагчы ўсё сілы, усе сродкі і кінуць іх на адсталыя вучасткі пасеўнага фронту. Не аб дэмабілізацыі, а аб мабілізацыі нашых партыйных і савецкіх арганізацый павінна ісьці гутарка.

Чвэртка пляну яшчэ ня выкананa. Ёсьць нагроза недасеву на важнейшых для нас тэхнічных культурах. Аб гэтым нельга забываць ні па мінуту.

Увесь ход пасеўнай кампаніі гаворыць аб рэальнай магчымасьці поўнага выкананьня пляну сяўбы па ўсіх культурах. На радзе важнейшых вучасткаў засеўнага фронту мы ўжо дабіліся значных посьпехаў. Мы пераможам і па ўсім фронце, калі ўзмоцнім работу ў гэтыя апошнія рашаючыя дні.

Бальшавіцкая засеўная кампанія патрабуе бальшавіцкіх ударных тэмпаў. Іх партыя чакае ад усіх сваіх арганізацый і, у першую чаргу, ад акруг, якія адстаюць у засеве тэхнічных культур.

Засеўны плян павінен быць і будзе выкананы. Гэтага патрабуюць інтарэсы сацыялістычнага будаўніцтва ў нашым краі, ад гэтага залежыць наша далейшае прасоўваньне наперад на шляху калектывізацыі сельскае гаспадаркі.

На аснове бальшавіцкага адзінства

XIII зьезд КП(б)Б у аднагалосна прыняй рэзалюцыі па справаздачы ЦК КП(б)Б прызнаў палітычную лінію ЦК галкам і поўнасьцю правільнай, а яго практычную работу здавальняючай.

Гэты дакумант, бязумоўна, глыбокага палітычнага значэньня. Ён завяршае этап у рабоце нашай партыі, падводзіць вынікі вялікай барацьбы, якая праведзена КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК і дае ацэнку гэтаму пройдзенаму этапу.

Прызнаньне зьездам правільнасьці па палітычнай лініі ЦК КП(б)Б адзначае, што ЦК у кіраўніцтве гіганцкім сацыялістычным будаўніцтвам у нашым краі, кіраўніцтвам барацьбой супроць ухілаў ад партыйнай лініі выходзіў з ленінскай, бальшавіцкай палітыкі, якую ажыцьцяўляе ЦК УсеКП(б). Прызнаньне правільнасьці палітычнай лініі ЦК КП(б)Б—гэта прызнаньне тых вялікіх посьпехаў і перамог, якіх дасягнула наша партыя, дзякуючы гэтаму правільнаму кіраўніцтву і гэтай ленінскай лініі барацьбы. І ніякія капітулянцкія крыкі апартуністычных элемэнтаў, гатовых спэкулюючых на часовых труднасьцях сучаснага пэрыяду, ня могуць паслабіць важнейшага выводу, які мы робім з пройдзенага этапу—выводу аб буйных перамогах, якія мы маем у справе разгортваньня сацыялістычнай індустрыялізацыі нашай рэспублікі, у справе ажыцьцяўленьня пералому ў галіне перабудоўкі сельскае гаспадаркі на сацыялістычны лад, у справе нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Прызнаньне правільнасьці палітычнай лініі ЦК КП(б)Б—гэта жорсткі бальшавіцкі ўдар па правых, «левых» і нацыянал-апартуністычных элемэнтах, якія прабавалі і прабуюць рэвізаваць гэтую лінію і змагацца супроць кіраўніцтва, якое яе (лінію) ажыцьцяўляе, гэта поўнае ўхваленьне ўсёй той вялікай барацьбы, якую праёў ЦК за чыстату партыйнай лініі.

Рэзалюцыя па справаздачы ЦК КП(б)Б прынята аднагалосна. Наша КП(б)Б, як ніколі падышла да свайго зьезду манапітнай і адзінай. Падставай гэтага адзінства зьяўляецца бальшавіцкая лінія, за якую актыўна змагалася і змагаецца ўся наша партыя супроць апартуністычных і нацыянал-апартуністычных элемэнтаў. Аднагалосна прынятая рэзалюцыя яшчэ раз падкрэсьлівае і дэманструе жалезнае адзінства нашых бальшавіцкіх радоў.

Дэманстрацыя бальшавіцкага адзінства нашай КП(б)Б, якая праявілася пры галасаваньні рэзалюцыі па дакладзе ЦК УсеКП(б) і цяпер, па справаздачы ЦК КП(б)Б, зьяўляецца запогам таго, што наша Беларуская арганізацыя будзе з вялікім посьпехам вырашаць як на самым зьезьдзе, так і пасьля яго тыя задачы, якія вырастаюць перад ёю ў галіне кіраўніцтва сацыялістычным будаўніцтвам БССР.

Дэманстрацыя адзінства на падставе бальшавіцкай лініі, гэта довад таго, што наша арганізацыя зьяўляецца згуртаванай і манапітнай апорай Ленінскага ЦК УсеКП(б) у барацьбе супроць ухілаў ад партыйнай лініі і спроб рэвізаваць гэтую лінію, спроб атакаваць і дыскрэдытаваць кіраўніцтва.

Прыняцьце рэзалюцыі па справаздачы ЦК папярэджвалі шырока разгарнуўшыяся спрэчкі. Яны праходзілі пры надзвычайнай актыўнасьці ўсяго зьезду. Лік выказаўшыхся—86 т. т. гаворыць сам за сябе. Спрэчкі праходзілі пад сьцягам бальшавіцкай самакрытыкі і сьмелага і бязьпітаснага выкрыцьця ўсіх недахопаў і памылак у нашай рабоце. Гэтыя бальшавіцкія адносіны да самакрытыкі, гэтая актыўнасьць зьезду служаць лепшым паказальнікам вялізарнага палітычнага росту нашай партыі, бальшавіцкі радоў і правільных адносін да вабнейшага лёзунгу нашага пэрыяду—лёзунгу самакрытыкі. Самакрытыка служыла і будзе служыць для КП(б)Б і яе Цэнтральнага Камітэту сродкам для мабілізацыі мас, выпраўленьня паасобных недахопаў і памылак, і правільнага і цьвёрдага ажыцьцяўленьня бальшавіцкай лініі.

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

ХАГО СУД МОЖА ПАЗБАВІЦЬ ПРАВА НА ПЭНСІЮ

ПАСТАНОВА СНК СССР

МАСКВА. Саўнарком СССР прыняў пастанову, паводле якога суд можа прысабачыць да ўсіх асоб, засуджаных за дзяржаўныя, контр-рэвалюцыйныя і асабліва небясьпечныя злачынствы, пазбаўленьне права на пэнсію і дапамогу.

ЗАСЕЯЦЬ 4,5 МІЛЬЁНЫ ГЭКТАРАЎ ЗЯМЛІ

МАСКВА. СНА даў дырэктыву Зерняцэнтру засеяць у падыходзячым годзе ня менш 4,5 млн. гэкт. і падрыхтаваць да сяўбы 1932 году 9 млн.

ДАДАТКОВЫЯ СРОДКІ СЬВІНАВОДСТВУ

МАСКВА. Саюзны Саўнарком прызнаў патрэбным адпусьціць дадаткова на патрэбы прамысловага сьвінаводства 22 млн. руб.

Цалкам выканаць плян сяўбы тэхкультур

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Заслухаўшы інфармацыю Народнага Камісарыяту Зямляробства аб выкананьні пляну засеву тэхнічных культур (ільну і канапель), Савет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Прыняць да ведама, што на ляніе засеву тэхнічных культур (ільну і канапель) выканана на 30 мая 1930 г.: па ільне 55 проц. і па канаплях 26 проц., а па ляніе кантрактацыі на той самы дзень: па ільне — 35 проц. і па канаплях — 35 проц.

2. Адзначыць, што такое нездавальняючае выкананьне пляну ўтварае нагрозу забесьпячэньню прамысловасьці тэхнічнымі культурамі для пераапрацоўкі і што акруговымі і раённымі выканаўчымі камітэтамі, асабліва Віцебскім, Полацкім і Аршанскім, няўжыты дастатковыя захады да выкананьня пляну.

3. Для выкананьня пляну засеву тэхнічных культур і скарыстаньня для гэтай мэты часу сяўбы, які яшчэ застаўся, прапанаваць:

а) Народнаму Камісарыяту Гандлю забесьпечыць выдачу гаспадаркам мануфактуры ня менш як на 10 руб. за кожны закантрактаваны гэктар ільну і канапель;

б) Белпаляводсаюзу і Беларускай Канторы Саюзкалгасбанку забесьпечыць выдачу насеннага матар'ялу і крэдыту гаспадаркам, якія заключаюць дагавары на кантрактацыю ільну і канапель і якім патрэбна насеньне;

в) акруговым і раённым выканаўчым камітэтам ужыць усе захады па давядзеньні пляну засеву тэхнічных культур да калгасаў і вёсак шляхам максымальнай мабілізацыі ўвагі да засеву тэхнічных культур калгасамі і бяднякам - серадняцкімі гаспадаркамі;

г) Белкалгасцэнтру, Народнаму Камісарыяту Зямляробства і Белпаляводсаюзу паслаць у ільнаводныя раёны працаўнікоў на час сяўбы тэхнічных культур.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў і знаменчнай нарады БССР М. КАЛЕВІЧ

7 чэрвеня 1930 г.
г. Менск.

Мануфактура кантрактантам ільну і канапель

Наркамгандаль БССР разьмеркаваў па акругах 12 вагонаў мануфэктуры, якія адпушчаны Наркамгандлем СССР спэцыяльна на кантрактацыю ільну і канапель. З агульнай колькасьці 936 кіп мануфактуры выдзелена для Магілеўскай акругі 205 кіп, Віцебскай —220, Полацкай — 170, Аршанскай — 178, Менскай—39, Гомельскай — 65, Бабруйскай — 94 і Мазырскай 9 кіп.

Такім чынам асноўная маса мануфактуры накіроўваецца ў ільнаводныя раёны БССР.

Учора Белкаапсаюз паслаў у Маскоўскае аддзяленьне Белкаапсаюзу тэлеграму-маланку аб тэрміновай адгрузцы мануфактуры ў ільнаводныя раёны БССР. На месцы гэта мануфактура чакаецца ў бліжэйшыя дні.

Адначасова Белкаапсаюз даў дырэктыву сваім нізавым арганізацыям давесьці да ведама пасеўшчыкаў ільну і канапель аб выдачы мануфактуры.

Мануфактура будзе выдавацца пасеўшчыку сыстэмай спажывецкай кааперацыі па запісках сыстэмы Белпаляводсаюзу, і гэтыя запіскі будуць зьяўляцца апраўдальнымі дакументамі для спажывецкай кааперацыі ў выдаткаваньні мануфактуры.

Ажыўлёны рух у лягеры ворагаў Савецтаў

У ЧАДЗЕ ПАДРЫХТОЎКІ АНТЫСАВЕЦКАЙ ВАЙНЫ

У ЦЬВЁРДАЛОБЫХ РУКІ СЬВЯРБЯЦЬ

ЛЁНДАН, 6. Сёньня дэбаты ў палаце абшчынаў аб ангельска-савецкіх адносінах ня ўнесьлі нічога новага. Ад імя кансэрватараў Лакер Лямпсон узьняў пытаньне аб камуністычнай прапагандзе, абвінавачваючы бязумоўна, савецкі ўрад у вядзеньні антыбрытанскай кампаніі ў ангельскіх уладаньнях. Між іншым, трэба адзначыць, заяву Лямпсона, што кансэрватары не супярэчаць супроць напярэдняй гандлю з СССР. У сваім адказе Гэндэрсон паказаў, што ўрад адпавіў адносіны з СССР у інтарэсах міру і гандлю. Далей міністар адзначыў, што нават калі-б зносіны, як таго дамагаецца Чэмбэрлен, былі-б спынены, дык гэта ня дало-б ніякіх гарантый супроць камуністычнай прапаганды, але за тое заказы з СССР спыніліся-б. У заключэньне Гэндэрсон зноў запэўніў кансэрватараў, што калі патрэбна будзе, дык урад узьніме гэтае пытаньне перад савецкім урадам.

ПРЫЯЗНАЯ ГАСЬЦІННАСЬЦЬ, ПАШЫТАЯ АНТЫСАВЕЦКІМІ НІТКАМІ

ВЕНА, 4. У апошнім часе Румынію наведалі мноства відныя французкія дзеячы, у тым ліку былы міністар фінансаў Лушэр, генэралы Бартэла, Гуро і вядомы спэцыялісты па навігацыі вайне Арно.

Ня гледзячы на ўсе спробы затушаваць сапраўдную мету гэтых «візытаў», паасобныя паведамленьні, зьмешчаныя ў друку, усё-ж праліваюць некаторае сьвятло на місію французкіх «гасьцей». Апошнімі днямі стала відома, што французкіх гасьцей суправаджае цэлы штат экспэртаў і спэцыялістых, у прыватнасьці вайсковых. У пачатку чэрвеня ўсе французкія госьці аб'ездуць у суправаджэньні вайсковага міністра дунайскія гавані і потым накіруюцца ў Бэсарабію на ўсходнія граніцы.

РЫГА, 6. Учора ў Рыгу прыехала экскурсія польскіх афіцэраў, усяго каля 60 чалавек. Увесь дзень прадстаўнікі латвійскай армії і польская пасольства вазілі польскіх афіцэраў на гораздзе і ваколіцах, паказваючы «цікавыя» рэчы Рыгі. Вечарам, у памяшканьні афіцэрскага клюбу, штаб латвійскай арміі даў банкет у гонар экскурсантаў.

Палякі, паводле заявы кіраўніка польскіх экскурсантаў генэрала Руцкевіча, засталіся вельмі задаволены «брацкім прыбмам, які ім аказалі ў Латвіі». Генэрал Руцкевіч абіцае ў бліжэйшым будучым зноў наведаць Латвію, каб «бліжэй пазнаёміцца з латвійскай арміяй».

ТОЛЬКІ АДЗІН МІЛЬЯРД, АЛЕ НА «МІРНЫЯ» МЭТЫ

БЭРЛІН, 29. Югаславія атрымала пазыку ў 1 мільярд дынараў (дынар--3 к.) на набыцьцё вайсковага рыштунку ў Францыі і Чэха-Славаніі. У лік пазыкі ў Югаславію прыбылі ўжо 300 вайсковых самалётаў.

НА МЕРТВЫМ ПУНКЦЕ

Наркамзэмам Беларусі дана заданьне —засіласаваць у гэтым годзе 1 млн. тон зялёнай масы. *) Гэтае заданьне разьмеркавана наступным чынам: 40 проц. прыпадае на калектыўны сэктар, 40 проц.—на індывідуальны сэктар, а рэшта—20 проц.—на саўгасы і дасьледчыя станцыі.

Пачатак работы ў гэтай галіне не абяцае нічога добрага. Возьмем, хаця-б пытаньне з будаўніцтвам сіласных установак. Спачатку паралылі пабудаваць 160 вежаў. Потым—350. Нарэшце, зноў пастанавілі будаваць толькі 160 вежаў. Белкалгасбуд, на які ўскладзена пабудова гэтых вежаў, праяўляе інэртнасьць і павольнасьць.

У вежах можна будзе засіласаваць толькі 6-7 проц. усёй зялёнай масы. Пераважная-ж частка апошняй (93-94 проц.) павінна быць засіласавана ў ямах і траншэях. Сюды трэба накіраваць максымальную ўвагу.

Трэба адзначыць, што фактычны зрыў сяўбы сілясных культур (кукурузы і слоначніку) і павольнасьць у пабудове ям і траншэй у значнай ступені тлумачыцца нераазуменьнем значэньня сілясу, незнаёмствам з практыкай сілясаваньня. Для папулярызацыі сілясу амаль нічога ня робіцца.

Калі ня лічыць старой брашуры тав. Журыка, дык у нас амаль зусім няма літаратуры аб сілясаваньні. Нават работнікі Наркамзэму маюць вельмі цьмянае ўяўленьне аб тэорыі і практыцы сілясаваньня. Ва ўсім апараце Наркамзэму няма ні аднаго спэцыяліста-кармавіка, які кіраваў-бы таксама справай сілясаваньня.

Каб азнаёміць актывістых-калгаснікаў і саўгаснікаў з практыкай і тэхнікай сілясаваньня, у бліжэйшы час зу большасьці раёнаў Беларусі павінны адкрыцца спэцыяльныя кароткатэрміновыя (двухтыднёвыя) курсы. Праз гэтыя курсы мяркуецца прапусьціць 3.500 калгаснікаў і саўгаснікаў. Хто-ж будзе выкладаць на гэтых курсах, як будуць выкладаць пры поўнай адсутнасьці літаратуры аб сілясаваньні—гэтыя пытаньні ня вырашаны.

Заўважаны, між іншым, наступныя факты.

Акруговы аграном, які прыехаў у калгас, на запытальне—як трэба сеяць сілясную культуру—кукурузу—адказвае, што ня ведае. Прадстаўніком Гомельскага акруговага камсамолу, калі яны зьвярнуліся за парадам і за дапамогай да кіруючых работнікаў калгасаўсоюзу, адказалі—«таварышы, ды мы і самі нічога ня ведаем пра гэты самы сілас». Рэдакцыя газэты «Чырвоная Зьмена» зьвярнулася да праўленьня Белкалгасцэнтру за дапамогай у арганізацыі кансультацыі па сілясе на старонках газэты. Ёю быў атрыманы наступны адказ—«ня можам гэтага зрабіць—няма часу, няма людзей».

І энтузіязм камсамольцаў—ініцыятараў і пачынальнікаў паходу за сілас,—які разьбіваецца аб глухую сьцяну бюракратызму, нішчэньнасьці і нявер'я, як быццам пачынае падаць. Гэтага нельга дапусьціць.

Неабходна, ўрэшце, узяцца за выданьне і распаўсюджаньне папулярнай літаратуры аб сілясе, за шырокую мабілізацыю грамадзкай думкі наўкола пытаньня сілясаваньня.

Трэба прабіць тую сьцяну інэртнасьці і неўтрунтаванага скэптыцызму, якія выраслі наўкола праблемы сілясаваньня.

Інакш мы ганебна правалім, правядзеньне ўскладзенага на Беларусь заданьня.

Л. Н-даў.

*) Саюзны НКЗем даў БССР заданьне засіласаваць 2 міл. тон. Рэдакцыя «Зьвязды» раз ужо зварочалася да НКЗ БССР з просьбай паведаміць, на якіх прычынах гэтае заданьне ім зьменшана ў 2 разы, але адказу да апошняга дня не атрымала.

На від Наркамгандлю БССР

МАСКВА, 7. Калегія наркамгандлю СССР наставіла на від Наркамгандлю БССР, ЗСССР, ТаджыкССР, ТуркменССР, УзбекССР і гандлёвым аддзелам Іваўпаўскай і Маскоўскай вобласьці, Ніжняй Волгі і Сібіры—невыкананьне пастановы калегіі аб пладова-гароднім будаўніцтве.

З гэктары ільну ў падарунак партзьездам

ЧЛЕНЫ КАЛГАСУ «СЕРП І МОЛАТ» (СІРОЦІНСКІ РАЁН, ВІЦЕБШЧЫНА) ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б і XVI ЗЬЕЗДУ УсеКП(б), ШТО ЯНЫ АББЯСЬЦІЛІ СЯБЕ ЎДАРНІКАМІ ІМЯ XVI ПАРТЗЬЕЗДУ І Ў ПАДАРУНАК ЗЬЕЗДУ ЗАСЯВАЮЦЬ ТРЫ ГЭКТАРЫ ІЛЬНУ ЗВЫШ ПЛЯНУ ЗА ЛІК БРОСАВЫХ ЗЯМЕЛЬ, НА 2 ТЫДНІ РАНЕЙ ТЭРМІНУ, Г. ЗН. 15 ЧЭРВЕНЯ ЗАМЕСТ 1 ЛІПЕНЯ Ў КАЛГАСЕ ЗАКАНЧВАЕЦЦА ПАВУДОВА ЦАГЕЛЬНІ ІМЯ XVI ПАРТЗЬЕЗДУ.

Сяўба ільну ў Аршаншчыне

ВОРША. На 5-е чэрвеня плян сяўбы ільну выкананы ў калгасах на 57 проц., і індывідуальным сэктары—на 87 проц. На 1-е чэрвеня пляны былі выкананы: у калгасах—на 48,5 проц., і індывідуальным сэктары—на 65 проц.

У цэлым па Аршанскай акрузе за апошнюю пяцідзёўку выкананьне пляну сяўбы ільну павялічылася з 73 проц. да 86 проц.

Замаразкі і гароды

Неабходна зараз-жа перасеяць

Упочы з 4 на 5 чэрвеня ад замаразкаў у БССР пацярпелі некаторыя агародныя культуры.

У сувязі з гэтым нашаму супрацоўніку ў Белкалгассадсаюзе паведамілі наступнае:

— Дакладных вестак аб плошчы пацярпеўшых культур яшчэ няма. Паводле папярэдніх даных, гуркі памёрзлі на ўсіх акругах БССР, рассада капусты і памідораў памёрзла толькі ў паўночных акругах — Аршанскай, Віцебскай і часткова ў Полацкай. Тут-жа памёрзла часткова і скорасьпелая бульба.

Белкалгассадсаюз прымае тэрміновыя меры для перасеву гуркоў і перасадкі капусты і памідораў там, дзе гэта патрэбна. Амаль ва ўсіх пацярпеўшых акругах ёсьць выстарчальная колькасьць рассады капусты і памідораў для перасадкі. У выпадку, калі дзе-небудзь гэтае рассады ня хопіць, яны ў тэрміновым парадку будуць перакінуты з іншых акруг.

Што датычыць насеньня гуркоў, дык у Бабруйскай, Мазырскай і Гомельскай акругах яно ёсьць і хопіць для перасеву. Белкалгассадсаюз ужо накіраваў у Аршанскую акругу 300 клгр. насеньня гуркоў і ў Смалявічы (Менская акруга) — 225 клгр. У бліжэйшыя дні ў Воршу будзе накіравана дадатковая колькасьць насеньня гуркоў. У выпадку, калі ў некаторых акругах ня хопіць насеньня для перасеву гуркоў, то плошча будзе засеяна іншымі гароднымі культурамі.

Белкалгассадсаюз учора тэлеграфна запрасіў усе раёны аб размерах пацярпеўшай плошчы гародаў, наяўнасьці ў мясцовых складах насеньня гароднины і рассады капусты і памідораў. Сёньня чакаюцца тэрміновыя адказы з раёнаў.

Становішча можна паправіць, калі будзе праяўлена належная распарадчасьць і ініцыятыва з боку мясцовых арганізацый.

Прабілі апошнія гадзіны „Нанкіна“

Бязупынны ланцуг паражэньняў нанкінскай арміі

ПЕРАМОЖНЫ МАРШ ЧЫРВОНЫХ НАПЕРАД

НА КРАЮ ПАГІБЕЛІ

ШАНХАЙ, 6. Нават бліжэйшыя прыяцелі і старонынікі нанкінскага ўраду выказваюць сур'ёзныя апасеньні за яго пёс. Са ўсіх франтоў паступаюць трывожныя весткі аб тым, што нанкінская войска панінула Чамша (цэнтр правінцыі Хунань), у якую ўступае войска Чан Фа-гуя. Чакаецца таксама падзеньне гораду Цзынань (правінцыя Шандунь), за ўладаньне якім ідуць моцныя баі.

Побач з няўдачамі на франтох фарсаваным тэмпам разьвіваецца эканамічны крызіс у тыле нанкінскага ўраду, з якога Нанкін ня можа выйсьці. Вялізарныя вучасткі зямлі зусім не апрацоўваюцца. Многія буйныя фірмы збанкрутавалі. Па ўсім Поўдні ня спыняецца наступленьне чырвоных часьцей. Ніколі раней становішча нанкінскага ўраду ня было такім хісткім.

ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ НАСТУПАЕ

ШАНХАЙ, 6. Камуністычная актыўнасьць у правінцыі Гуандун узрастае. У пагранічнай тэрыторыі правінцый Фуцьзян, Цьзяньсі і Гуандун 18 акруг заняты чырвонымі часьцямі. Адначасова паведамляецца аб заняцьці чырвонымі часьцямі пагранічных гарадоў Луначжоу, Юнцін і Шанхан.

На поўнач Гуандунскай правінцыі высыпаецца войска для барацьбы з наступленьнем 10-тысячнай Чырвонай арміі.

У заходнім Гуансі камуністыя займаюць горад Лінчжоу. Чакаецца наступленьне чырвоных часьцей на суседнія гарады. Мясцовыя сяляне энэргічна падтрымліваюць чырвоныя часьці. Маюцца весткі, што рад гарадоў паўночна-ўсходняй часьці правінцыі Гуансі таксама заняты чырвонымі часьцямі.

ДРЫЖАЦЬ ЗА ЎЛАСНУЮ СКУРУ

ПЭЙПІН, 6. Японскія ўлады ўзмацнілі паліцэйскую варту японскага консульства ў Цзынані (галоўны горад Шандуньскай правінцыі), адкуль пачалося павальнае бегства чыноўнікаў нанкінскага ўраду з чужаземцаў. Дыпляматычны корпус у Пэйпіне рыхтуе патрабаваньні нанкінскаму ўраду і войскам Ен Сі-шана і Фын Юй-сяна аб спыненьні ваенных дзеяньняў у раёне Цзынаня.

БЕЛАГВАРДЗЕЙЦЫ ГРАБЯЦЬ

ТОКІЁ, 7. Тэрор белагвардзейскіх банд, якія апэруюць у раёнах Хайлара, Чжаромта і Ядзеньш, узмацніўся. У пасёлку Шыніпан белагвардзейцы ограбілі і забілі 20 кітайцаў.

У КРЫВАВЫХ СХВАТКАХ ЗА РЫС

ШАНХАЙ, 6. У Лахайскім павеце правінцыі Чжэцьзян галадуючыя сяляне абыходзяць двары памешчыкаў і адбіраюць харч. Рысавы голад ахапіў правінцыі Цьзянсі, Гуандунь, Цьзянсу, Чжэцьзян і Анхуэй. Паводле апошніх вестак, у правінцыі Цьзянсу загад сялян напаў на лодкі, якія перавозілі рыс з вёскі ў горад Пуань. Пасьля жорсткай барацьбы сяляне заўладалі рысам. У павет Наньсян супроць галодных сялян выслены войскі.

НАНКІН АБВЯРГАЕ

ТОКІЁ, 6. Агенцтва Сімбун-Рэнга ў Нанкіне паведамляе, што нанкінскі ўрад абвяргае паведамленьні аб тым, нібы, савецкі ўрад патрабаваў варты для дыпляматычных прадстаўніцтваў СССР у Кітаі і г. д.

НА ЛІНІЮ АБАРОНЫ

ПЭЙПІН, 6. Нанкінскія войскі спарацілі лінію фронту ў раёне Лунхайскай і Цьзян-Цьзін-Пукоўскай чыг. і пераходзяць да абарончай тактыкі. Яны будуюць траншэі у раёне Цзінпань (ст. Лунхайскай чыг. на паўночным захадзе правінцыі Цьзянсу, у 30 клм. ад Шандуньскай мяжы).

ПАД ПАГРОЗАЙ З ДВУХ БАКОЎ

ЛЁНДАН, 4. Як падаюць з Пэйпіна, нанкінскія войскі **пад пагрозай з двух бакоў.** Лідэры паўночнай арміі заклуюць аб буйных перамогах, атрыманых імі па фронце Лунхай-Ханькоўскай чыгункі і аб тым, што гуансійскія войскі набліжаюцца да Ханькоў з поўдню (ТАСС).

ЗАБАСТОВАЧНАЯ ПАВОДКА Ў ШАНХАІ

ШАНХАЙ, 4. За апошні час у Шанхаі шырока разгарнуўся забастовачны рух. Характэрна, што большасьць забастовак праходзіць пад кіраўніцтвам чырвоных прафсаюзаў і канчаецца перамогай рабочых. У Вуаупе (ваколіцы Шанхая) 700 рабочых чыгуначных майстэрань у выніку забастоўкі дабіліся ўвядзеньня 8-гадзіннага рабочага дня. Тут-жа баставалі 3.000 рабочых і работніц бавоўняна-папяровай фабрыкі Вінгон, пры чым фабрычная адміністрацыя задаволіла ўсе патрабаваньні баставаўшых. Па закліку чырвоных прафсаюзаў абвясьцілі стачку 400 перапілётчыкаў вялізарнай фірмы Інхокі. Апошнімі днямі ў Шанхаі адбыліся яшчэ дзьве стачкі—рабочых гарбарні і рабочых млына. Гарбары дабіліся прызнаньня свайго прафсаюзу, а рабочым млына была павышана зарплата.

У ШАНХАІ І НАНКІНЕ ПАНІКА

ПЭЙПІН, 31. Паводле вестак з Шанхаю і Нанкіна, у гэтых гарадох панує паніка, якая выклікаецца, з аднаго боку катастрафічным зьніжэньнем курсу серабра, а з другога—посьпехам камуністычных часьцей і паражэньнем нанкінскіх войск на поўначы. Многія замежныя і кітайскія прадпрыемствы ў Шанхаі абанкрутавалі. У Бухане сканцэнтравалася каля 300.000 бежанцаў з унутранае часьці Кітаю. Ёсьць чуткі, што нанкінскі ўрад, каб выратаваць становішча, нарашчу прымусіць Чан Кай-шы падаць у адстаўку і замяніць яго Фынам Чунара (правы гоміндапавец, зараз займае пост міністра шляхоў зносін).

НА ЧАЛЕ ЗАБАСТОЎКІ КАМУНІСТЫЯ

ШАНХАЙ, 31. Газэта «Шанхай Бао» паведамляе, што **на чале забастоўкі рабочых** «міжнароднай экспартнай кампаніі», якая пядаўна скончылася ў Нанкіне, **стаялі камуністыя.** Забастоўка была задушана паліцэйскімі мерамі. Арыштавана шмат тубыльцаў і рабочых. Газэта зазначае, што камуністыя ў Нанкіне, правялі рад рашучых выступленьняў супроць імпэрыялізму і Гаміндану. Паліцыя арыштавала зноў 50 камуністых. Арыштаваныя будуць дапытаны самым Чан Кай-шы. Горад абвешчаны ў стане аблогі.

Самаправерка зусім невыстарчальна выкарыстана для мабілізацыі рабочых мас

Там, дзе самаправерка прайшла фармальна, бяз удзелу рабочых мас, і не стварыла пералому ў выкананьні прамфінпляну, зрабіць яе паўторна

Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 1 чэрвеня 1930 году аб ходзе самаправеркі выкананьня прамфінпляну, сацспаборніцтва і ўдарніцтва

Адзначаючы некаторыя посьпехі ў правядзеньні самаправеркі ў радзе заводаў (завод імя Пятроўскага, Злагаўстаўскі мэталёвы завод і інш.), якія выявіліся ў замацаваньні ўдарных брыгад і стварэньні новых, у барацьбе з іляжэ-ўдарніцтвам, у канкрэтызацыі самаабавязацельстваў і г. д., ЦК УсеКП(б) у той-жа час лічыць, што **ў большасьці раёнаў самаправерка была зусім невыстарчальна скарыстана для мабілізацыі рабочых мас, прафсаюзных і гаспадарчых органа

XIII ЗЬЕЗД КП(б)Б

Даклад т. Трылісера аб дзейнасьці і рабоце Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі УсеКП(б)*)

Таварышы, раней чым прыступіць да свайго дакладу, дазвольце ад імя Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі Усесаюзнай Камуністычнай партыі бальшавікоў вітаць XIII-ты зьезд Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі (аплёдысмэнты).

I. Уступ

Посьпехі нашай партыі за час ад XV зьезду перад вамі ўжо ў выстарчальнай ступені былі асьветлены ў дакладзе ЦК УсеКП(б). Посьпехі грандыёзныя. Дасягненьні рэвалюцыйнай практыкі нашай партыі, дзякуючы правільнай генэральнай лініі, праводзімай нашым ленінскім ЦК, нашчэпт разьбілі розныя апартуністычныя капітулянцкія тэорыі правых і нашчэпт разьбілі контр-рэвалюцыйны трацкізм.

Мы зараз уступілі ў такую паласу разьвіцьця нашага сацыялістычнага будаўніцтва, калі саюз рабочае клясы і асноўных мас сялянства грунтуецца на новай аснове, на аснове разгортваньня нашай буйной сацыялістычнай прамысловасьці, саўгасаў—з аднаго боку, і разьвіцьця калгаснага будаўніцтва, сацыялістычнай перабудовы вёскі — з другога. Правільная лінія нашай партыі, якая цьвёрда праводзіцца нашым Цэнтральным Камітэтам, стварыла матар'яльныя ўмовы для вялікага гістарычнага павароту ад палітыкі выцісканьня і абмежаваньня капіталістычных элемэнтаў да палітыкі рашучага наступленьня на капіталістычныя элемэнты,—ад палітыкі абмежаваньня эксплёататарскіх тэндэнцый да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы», у раёнах суцэльнай калектывізацыі. Новыя вытворчыя формы зьмычкі гораду і вёскі, напружаныя тэмпы разьвіцьця індустрыялізацыі СССР, замацаваньне поўнае і далейшы рост капітаснага будаўніцтва забясьпечваюць «стварэньне глядзе.

фундаманту сацыялістычнага грамадзтва» (тэзісы т. Якаўлева) стваракоць «такую сувязь паміж горадам і вёскай, якая забясьпечвае перамогу сацыялізму» (Сталін). Гэтых вялізарных посьпехаў партыя дабілася ў рэзультаце жорсткага змаганьня за генэральную лінію, пасьлядоўнага, вытрыманага змаганьня супроць галоўнейшай небясьпекі для партыі—правага ўхілу, супроць «левага» апартунізму, які ўзмацняе правую небясьпеку, і супроць прымірэнцтва да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі. Шлях будаўніцтва сацыялізму ў нашым Саюзе Сацыялістычных Савецкіх Рэспублік — гэта не нагулянка па алеях, гэта шлях самага жорсткага, напружанага клясавага змаганьня з капіталістычнымі элемэнтамі ўнутры нашага Саюзу і капіталістычным сьветам па-за нашым Саюзам. Шалёную нянавісьць усяго капіталістычнага сьвету, шалёнае супраціўленьне капіталістычных элемэнтаў унутры нашага Саюзу выклікаюць кожны посьпех на фронце нашага сацыялістычнага будаўніцтва, кожны крок наперад у справе ўмацаваньня новых вытворчых форм зьмычкі пралетарыяту і асноўных мас сялянства. І гэта зразумела, бо нашы посьпехі—вярнейшая пагібель для ўсіх рэштак капіталізму ў нашым Саюзе і магутны ўдар па ўсёй сусьветнай капіталістычнай сыстэме. Але тым шырэй, глыбей мабілізуюцца пралетарскія бядняцкія і серадняцкія масы вакол нашай партыі, якое дакладна ўскрываецца, і таму знаходзіць свой адбітак, у тым, што ў гэтым выпадку самакрытыка зацісканецца. Ня гледзячы на вялізарныя дасягненьня, якія мы маем у справе разгортваньня самакрытыкі, мы усё яшчэ ня можам сказаць поўнасьцю, што мы ўжо дасягнулі таго ўзроўню разьвіцьця самакрытыкі, які дазваляе нам лічыць пытаньне вычарпаным. Пытаньне далёка яшчэ, таварышы, ня вычарпана, і задача далейшага разгортваньня здаровай бальшавіцкай самакрытыкі, накіраванай на ўзмацненьне партыі на павышэньне яе баяздольнасьці, на выканаьне вялікага пляну сацыялістычнай рэканструкцыі Савецкага Саюзу, ня зьнімаецца з парадку дня.

V. Барацьба за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва

Пераходжу да другой часткі свайго дакладу, якую пастараюся ўлажыць у магчыма кароткі час. Я ўжо гаварыў у пачатку, што задачы барацьбы за адзінства нашай партыі, якія нашы кантрольныя камісіі ажыцьцяўляюць разам з усёй партыяй, ня могуць быць вырашаны ў межах толькі пытаньняў чыста-партыйнага характару, пытаньняў, якія датычаць толькі партыйных арганізацый. Барацьба за адзінства партыі непарыўна зьвязана з барацьбой за захаваньне, умацаваньне саюзу пралетарыяту і асноўных мас сялянства, а гэта значыць, што перад ЦКК-РСІ, як і перад усёй партыяй, стаялі і стаяць задачы ажыцьцяўленьня такіх умоў работы нашых гаспадарчых і савецкіх арганізацый, якія максымальна забясьпечылі-б магчымасьць на справе ажыцьцёўць пастаўленыя партыяй задачы. Паскарэньне тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, выкананьне пяцігодкі за 4 гады, узьдым прадукцыйнасьці працы, барацьба са стратамі, зьніжэньне сабекошту, узьняцьце якасьці прадукцыі, разьвіцьцё сацыялістычнага спаборніцтва, ударніцтва, разьвіцьцё ўсіх новых форм удзелу мас у сацыялістычным будаўніцтве (пэфства працдрыемстваў над установамі і г. д.), сацыялістычная перабудова сельскае гаспадаркі, барацьба з бюракратызмам, чыстка савецкага апарату, патаненьне і скарачэньне яго і г. д., і г. д. На шляхох вырашэньня гэтых задач знаходзіць сваё вырашэньне адна з асноўных задач, якія стаяць перад ЦКК-РСІ, задача захаваньня і ўмацаваньня саюзу дзьвёх асноўных кляс нашага СССР.

Падагульваючы работу ЦКК-РСІ, якая захапляе ўсе разнастайныя галіны нашай гаспадаркі, як у галіне прамысловасьці, так і сацыялістычнай перабудовы вёскі, а таксама і ў галіне рэарганізацыі работ гаспадарчых і савецкіх апаратаў, трэба сказаць, што побач з многімі недахватамі, усё-ж тут мы маем вялізарныя дасягненьні. Гэтыя дасягненьні зусім бясспрэчны. Адным з буйнейшых дасягненьняў трэба лічыць тое, што ЦКК-РСІ за справаздачны пэрыяд здолела амаль поўнасьцю аўладаць мэтадамі масавай работы. Мы ўжо бачылі, што ў справу чысткі нашай партыі былі ўцягнуты мільёны рабочых і блізкіх нам сялянскіх мас вёскі—батрацтва, беднаты і часткова серадняцтва. А ў справу чысткі савецкіх апаратаў, якая знаходзіцца ў разгары, нам удалося ўцягнуць ад 4 да 5 мільёнаў шырокіх беспартыйных мас рабочых і працоўнага сялянства. Нябывалы ўздым актыўнасьці рабочых мас на фабрыках і заводах стварыў і стварае вялізарныя магчымасьці для работы КК і РСІ па далейшым уцягненьні мас у справу выкананьня прамфінпляну, барацьбы за якасьць, за зьніжэньне сабекошту, за плянавую рэканструкцыю, паталненьне і павышэньне якасьці капітальнага будаўніцтва і выяўленьне скрытых рэзэрваў прамысловасьці.

У мэтах абсьледваньня вострага дэфіцыту асноўных будаўнічых матар'ялаў і стварэньня максымальна добрых умоў для капітальнага будаўніцтва, НК РСІ правёў рад абсьледваньняў цагелень, вапняных, цэмэнтных, агнятрывалых прадпрыемстваў, лесапілень і іншых заводаў. Абсьледваньнем было ўстаноўлена, што затрудненьні ў будаўнічых матар'ялах, у першую чаргу зьвязаны з буйнымі памылкамі ў плянаваньні і рэгуляваньні прамысловасьці будаўнічых матар'ялаў. Былі выяўлены факты, калі печы буйнейшых надмаскоўных заводаў выкарыстоўваліся ў паасобных выпадках на 50 проц. магутнасьці, а маскоўскае будаўніцтва падвозіць дзесяткі мільёнаў цэглы з паўднёвых раёнаў СССР.

Абсьледваньні 1928-29 і 30 году Маскоўскай, Ленінгрдзкай абласьцей, Уралу, Украіны і Паўночна-Каўкаскага краю ўстанавілі, што магутныя заводы выкарыстаны на 70-90 проц. Па прадстаўленьні НК-РСІ вытворчая праграма на 1928-29 год, складзеная ВСНГ, была павялічана на 220 мільёнаў штук цэглы, 540 тыс. бочак цэмэнту і 600 тыс. куб. мэтраў піламатар'ялаў. Штогадовая праверка становішча прамысловасьці будаўнічых матар'ялаў спрыяла пашырэньню вырабу матар'ялаў па лініі прамкапэрацыі. Павялічаны праграмы, капітальныя ўкладаньні, выкарыстаньне малапашыраных матар'ялаў і г. д.

Распрацаваны НК РСІ праект заказу (прыняты ўрадам 26-XII 29 г.) вызначае цэлы рад мерапрыемстваў па аздараўленьні будаўніцтва і памяншэньні яго сабекошту.

У выніку мерапрыемстваў НК РСІ дасягнуты значныя павялічэньні вытворчых праграм. Вось, напрыклад, па сельска-гаспадарачым машынабудаўніцтве: «Любярэцкі завод (жнявяркі, касілкі і інш.) даваў прадукцыю ў 9 мільёнаў рублёў, а пасьля рэканструкцыі, паводле праекту РСІ—32 мільёны рублёў, Варонескі завод (трыеры) паводле пляну заводу 6 тыс., а паводле праграмы РСІ—18 тыс. і ў 1929-30 г.—36 тыс. Або вось узяць завод «Чырвоны Путілавец» (трактары): паводле пляну ў 1928-29 годзе—1.800 штук, а паводле пляну РСІ—3.000 штук, а ў 1929-30 г. паводле пляну ВСНГ і РСІ 12.000 штук. Па варштатабудаўніцтве: паводле пляну ВСНГ і заводаў—22 міл., а паводле пляну РСІ—47 міл.

Вялікія посьпехі дасягнуты ў выніку прапаноў ЦКК-РСІ і ў справе скарачэньня імпарту. Праведзеныя РСІ мерапрыемствы дадуць у 1930-31 г. эканомію на імпарце ў 2.800 тыс. руб. у валюце.

ЦКК-РСІ правяла абсьледваньне паўднёва-руднага трэсту Уральскай жалезарудная прамысловасьці і інш. Абсьледваньне паўднёва-руднага трэсту выявіла неадпаведнасьць пляну здабычы руды з запатрабаваньнямі капітальнага будаўніцтва. Паводле падлікаў геалкому, запасы руды ў Крывырожжы акрэсьліваюцца ў 466 мільёнаў тон, між тым, сапраўдныя запасы руды значна вышэй геалкомаўскіх падлікаў і дасягаюць 803 міл. тон. Ня ўлічаны магчымасьці здабычы руды ў скважынах вялікай глыбіні (да 462 і 525 мэтраў). Паўднёва-рудны трэст таксама недаацаніў значэньня маяўнасьці ў нас 4 мільёнаў квадр. мэтраў неразведанай плошчы на тэрыторыі капалень у той час, як кожны мэтр у Крывырожы дае 35-40 тон здабычы ў год. У выніку падобных пралікаў пяцігадовы плян здабычы руды на Краварожжы быў са значным памяншэньнем. 1932-33 годзе паводле пляну паўднёва-руднага трэсту—12,27 міл. тон руды, а патрэбнасьць мэталюргічных заводаў—15,1 міл. тон. Гэта значыць, плянам захоўваецца дэфіцыт у 1932-33 годзе 2,5 міл. тон, а ў 1934-35 годзе—6 міл. тон.

ЦК партыі па прапанове ЦКК-РСІ абавязаў ВСНГ давесьці плян здабычы руды на 1929-30 год да 8 міл. тон у той час, як плян трэсту прадугледжваў 5,9 міл. тон; на 1932-33 год 16 міл. тон у той час, як паводле пляну паўднёва-руднага трэсту, прадугледжвалася 12,2 міл. тон. Прынят таксама ЦК рад прапаноў па выкананьні заказаў паўднёва-руднаму трэсту на абсталяваньне, узмацненьне мэханізацыі, упарадкаваньне транспарту, пабудову жыльлёвых будынкаў і г. д.

Абсьледваньне ўральскай жалезарудной прамысловасьці НК-РСІ ўстанавіла, што побач з тэхнічнай адсталасьцю работа на руднікох вялася бясплянавабезгаспадарча і бяссыстэмна, што прывяло да разрыву паміж здабычай і падрыхтоўчымі работамі. Пастановай НК РСІ ўжыта рад зьмен па зьнішчэньні меўпых месца там недахопаў, вынята з работы каля 10 адказных работнікаў, а на рад асоб накладзены дысцыплінарныя спагнаньні і перададны справы пракурору.

Як адзін з прыкладаў дзейнасьці РСІ, трэба паказаць на выкрытае адсталаьне мэханізацыі хлебапячэньня: напава абсталяваньня ў СССР 60 хлебазаводаў і ўсе гэтыя хлебазаводы забясьпечваюць зараз хлебам 5 мільёнаў чалавек, або толькі з проц. насельніцтва Савецкага Саюзу. Між тым, саматужная выпечка хлеба дае нам вялікія страты, якія складаюць 5 мільёнаў рублёў у год параўнальна з мэханічным хлебапячэньнем. Бюро актыву спецыялістых распрацавала варыянт пяцігодкі мэханічнага хлебапячэньня. Прэзыдыум ЦКК-РСІ у асноўным прыняў гэты варыянт, які дае значныя зьмены пяцігодкі. Так, хлеб мэханічнай выпечкі паводле пляну Наркамгандлю ў 1932-33 годзе атрымлівае 5 проц. насельніцтва, а паводле пляну НК РСІ—25 проц. Хлебам мэханічнай выпечкі будзе карыстацца 66 проц. гарадзкога насельніцтва і насельніцтва сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі па 15 проц.

У адпаведнасьці з пастановамі XV-га зьезду аб фарсаванай сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі і наступленьні на кулацтва, ЦКК-РСІ на аснове вывадаў шырокага абсьледваньня сацыялістычных і капіталістычных элемэнтаў у сельскай гаспадарцы (канец 1927 году), якія атрымалі сваё пацьвярджэньне ў пастановах зьезду, разьвіла гэтыя дырэктывы ў сваіх далейшых мерапрыемствах па праверцы выкананьня дырэктыў партыі.

Абсьледваньне мерапрыемстваў у галіне павышэньня ўраджайнасьці, якое зьявілася шырокай і дэтальнай праверкай усёй дзейнасьці зямельных органаў па разьвіцьці вытворчых сіл у сельскай гаспадарцы, высунула ва ўвесь рост праблему ўзьдыму ўраджайнасьці і цэлы рад мерапрыемстваў, якія атрымалі сваё афармленьне ў дэкрэце ЦКК, ухваленым на 4-ай сэсіі ў сьнежні 1928 году па дакладу НК РСІ і ў асобнай пастанове аб распрацоўцы пытаньня аб саюзным кіраўніцтве сельскай гаспадаркай. Абсьледваньне высунула задачу павышэньня ўраджайнасьці ня менш, чым па 35 проц. на бліжэйшыя 5 год і ўгрунтавала магчымасьць яшчэ больш рашучых посьпехаў у сельскай гаспадарцы пры ўмове стварэньня буйнога калектыўнага зямляробства, будаўніцтва саўгасаў і рашучай перабудовы работы зямельных органаў, якія часамі сваім кансэрватызмам, нярухомасьцю, земскай практыкай, сыстэматычнымі сказжэньнямі клясавай лініі і палітыкі партыі зводзілі на нішто і абясцэньвалі правадзімыя мерапрыемствы ў галіне ўзьдыму ўраджайнасьці.

НК РСІ выявіў таксама, што сыстэма мерапрыемстваў, што праводзяцца зямельнымі органамі, у асноўным арыентавана на індывідуальніка, ня ўвязана з задачамі гаапэраваньня і калектывізацыі і часта ідзе на карысьць кулаку ў разрэз з палітыкай партыі па вёсцы.

Узмацненьне барацьбы з гэтымі сказжэньнямі і ўпарадкаваньне кіраўніцтва сельскай гаспадаркай у сучасны момант замацаваны арганізацыяй Усесаюзнага Наркамзему і мерапрыемствам чысткі зямельных органаў.

У мэтах забясьпечэньня тэмпаў узьдыму ўраджайнасьці і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, НК РСІ праводзіў цэлы рад абсьледваньняў: праверка забясьпечэньня трактараў запаснымі часткамі да веснавой сяўбы, на ўзмацненьні трактарабудаўніцтва і г. д.

Пытаньні калгаснага будаўніцтва ў работах ЦКК РСІ атрымалі выраз нае адлюстраваньне ў абсьледваньні ўвесну 1928 году і пачатку 1930 году. Першае абсьледваньне правяла гатоўнасьць усіх органаў да новага этапу ў разьвіцьці сельскае гаспадаркі. Устаноўлена была надзвычай дрэнная работа органаў (дзяржаўных, каапэрацыйных і грамадзкіх) у справе садзейства калектывізацыі, вясковыя органы аказаліся фактычна ў хвасьце калгаснага руху, крэдытаваньне і вытворчае забясьпечэньне калгасаў было абсалютна невыстарчальным, нанава арганізаваныя калгасы аказаліся без выстарчальнага арганізацыйна-інструктарскага кіраўніцтва як агрыкультурнага, так і тэхнічнага.

НК РСІ быў вывучан першы вопыт работы на такім важнейшым вучастку работы па калектывізацыі і тэхнічнай перабудове вёскі, якім зьяўляюцца машына - трактарныя калёны і станцыі. Вялізарная работай НК РСІ зьяўляецца актыўны ўдзел у выданьні новага закону аб с.-г. падатку, дзеля чаго было праведзена спэцыяльнае абсьледваньне, якім былі адхілены факты перааблкладаньня серадняка і пераабкладаньня шмат'ядоцкіх гаспадарак.

З-за недахвату часу абмяжуемся падаными па выбары ілюстрацыямі, якія прадстаўляць назначную частку прыведзеных, на аснове пастаноў партыі, работ ЦКК-РСІ. Але і сказанае дае прадстаўленьне аб характары і напрамку дзейнасьці ЦКК-РСІ за справаздачны пэрыяд. Тут я хацеў-бы яшчэ раз напомніць, што закон сваёй работы ЦКК-РСІ непасрэдна зьявяўлася з рабочай масай. У справе праверкі выкананьня прамфінпляну, праверкі ходу сацспаборніцтва, так і іншых работ, ЦКК раслала сваіх членаў па розных прадпрыемствах для таго, каб апошнім дапамагчы ў гэтых работах. Вы ведаеце, што па першым квартале мы мелі амаль усюды ў галіне выкананьня прамфінпляну значныя прарывы. І тут трэба падкрэсьліць, што, як агульнае правіла, а ва многіх месцах і нашы кантрольныя камісіі, невыстарчальна ўмелі своечасова скарыстаць той вялікі ўздым, які вызначыўся ў рабочай клясе. Атрымаліся быццам ножніцы паміж ростам актыўнасьці, сьвядомасьці шырокіх рабочых мас, перадавы атрад якіх пачаў уступаць у партыю, і няздольнасьцю мясцовых арганізацый павярнуцца, каб своечасова стаць на чале гэтага руху, пераключыць яго на рэйкі практычнае работы для забясьпечэньня ўмоў выкананьня прамфінпляну.

І ва многіх выпадках кантрольныя камісіі аддавалі невыстарчальную ўвагу гэтаму моманту. Работа кантрольных камісій у справе мабілізацыі грамадзкасьці ў рабоце прафсаюзнай і партыйнай не заўсёды была на вышыні. У будучым гэты недахват павінен быць кантрольнымі камісіямі ў сваёй рабоце ўнікнут.

VI. Работа па рацыяналізацыі, паляпшэньні і патаненьні апарату

Пытаньню паляпшэньня дзяржаўнага апарату ЦКК-РСІ аддавала вялікую ўвагу. Работа РСІ па паляпшэньні дзяржаўнага апарату ішла па дзьвёх лініях: рацыяналізацыі і спрашчэньні апарату, зьнішчэньні ўсякага паралелізму ў рабоце апаратаў, па лініі ачышчэньня савецкага апарату ад чужых элемэнтаў і па лініі арабочаньня, па лініі барацьбы з бюракратызмам, цяганінай, па лініі скарачэньня штатаў.

Я тут хачу падаць толькі некалькі фактаў, найбольш буйных, якія характарызуюць напрамак, па якім вялася работа ЦКК-РСІ. Асноўнай важнейшай работай па паляпшэньні візавога савецкага апарату за гэты пэрыяд зьяўляецца правядзеньне карэннай рэарганізацыі, акругова - раённай сыстэмы савецкага апарату, асноўныя прынцыпы якое (перадача апэрацыйных функцый візавым зьвеньням: раёнам, гарсаветам, сельсаветам) былі пацьверджаны XVI партканфэрэнцыяй.

У цяперашні час гэтыя прынцыпы рэарганізацыі апарату ажыцьцёўлены ў вопытным парадку ў 6 акругах пад кіраўніцтвам НК-РСІ (Армавірская, Курская, Чалябінская, Віцебская, Зіноўеўская і Віньніцкая). У гэтых акругах рэарганізаваны савецкі апарат (уключаючы судовыя органы), банкаўская сыстэма і каапэрацыя, часткова і саюзы. У гэтых акругах ліквідаваны аддзелы, а створан замест іх інспэктарскі кадр і плянава - статыстычныя органы, у якіх сканцэнтравана ўсё плянаваньне і статыстыка, спрошчана і палепшана абстаноўка справаздачнасьці, рахункаводства і справаводства.

ПРАЦЯГ ГЛЯДЗІ НА 3-Й СТАРОНЦЫ

Ордэн Леніна--тав. Сталіну

XIII зьезд КП(б)Б аднагалосна пастанавіў хадайнічаць аб узнагародзе т. І. В. СТАЛІНА ордэнам Леніна

Дзеньнік зьезду

На ранішнім пасяджэньні 7-га чэрвеня была заслухана справаздача ЦКК КП(б)Б, зробленая тав. **Калініным.**

У спрэчках па справаздачы ЦКК КП(б)Б выступілі т. т. **Шастакоў, Ігнатоўскі, Рыхтэр, Жураўлёў, Валодзька і Палкін.**

На вячэрнім пасяджэньні ў спрэчках выступалі т. т **Мачальскі, Жуковіч, Цёмкін, Пасюкевіч, Кудзелька, Палей, Хасман, Карпенка, Амбражунас, Дамброўскі, Грынбэрг, Сапун, Рашкоў, Серкін і Міхайлоўская.**

Ад пагранічнікаў зьезд вітаў тав. **Ражкоў.**

У сваёй прамове тав. Ражкоў сказаў: «Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі мы дабіліся вялізарных посьпехаў. На сёнешні дзень мы маем ударны полк, 60 проц. індывідуальных ударнікаў».

З адказам на прывітаньне ад імя зьезду выступіў т. **Аранштам.**

Зьездам пасланы прывітальныя тэлеграмы **Маскоўскай і Ленінградзкай партканфэрэнцыям і XI зьезду кампартыі балышавікоў Украіны.**

---

*) Друкуецца ў значна скарочаным выглядзе

XIII ЗЬЕЗД КП(б)Б

Даклад т. Трылісера аб дзейнасьці і рабоце ЦКК УсеКП(б)*)

Калі да рэарганізацыі акруговы бюджэт нагінаў 24,4 проц. ад штату апарату акруговага, раённага і ўсіх сельсаветаў і 41 проц. яго кошту, то пасьля арганізацыі 14,2 проц. і 24,1 проц. акруговы апарат скарочан на 43 проц., з 2.348 да 1.333 чалавек, а рэшта раённікаў перасунута ў нізавы апарат. Перабудова апарату, спрашчэньне і ўдасканаленьне яго таксама атрымалі належнае адлюстраваньне ў цэлым радзе агульных мерапрыемстваў НК РСІ, распачатых дзяржінстытутам тэхнікі кіраваньня, які зьяўляецца мэтадычным кіраўнікам - дасьледчым цэнтрам рацыяналізацыі тэхнікі кіраваньня.

У адпаведнасьці з пастановамі XV-га з'езду УсеКП(б), якім на ЦКК-РСІ была накладзена задача «няўхільна працягваць работу на патаненьні і спрашчэньні адміністрацыйнага, гандлёвага, канцэсыйнага і прамысловага апарату, у прыватнасьці давесьці да канца па ўсіх без выключэньня зьвеньнях кіраваньня і гаспадаркі скарачэньне адміністрацыйна - кіраўнічых выдаткаў у 1927-28 годзе ня менш, чым па 20 проц., строга правяраючы фактычнае правядзеньне яго ў жыцьцё».

Разгорнутай работай, якая ахапіла як бюджэтныя ўстановы, так і ўсе аб'яднаньні і прадпрыемствы, праверка фактычнага скарачэньня адміністрацыйных выдаткаў, праведзеная ў 1927-28 годзе, забясьпечыла агульнае скарачэньне адміністрацыйна - кіраўнічых выдаткаў па ўсіх зьвеньнях кіраваньня і гаспадаркі ў суме звыш 300 мільёнаў рублёў і скарачэньне штату работнікаў адміністрацыйна - кіраўнічага апарату на 100 тыс. чалавек.

Гэта вялізнае дасягненьне патрабавала ад ЦКК-РСІ напружанай работы.

VII. Чыстка савецкага апарату

Чыстка савецкага апарату, якая эпадзіцца ў самым разгары, прайшла д этапаў. Першы пэрыяд, калі быў нут дэзынт аб чыстцы савецкага апарату, чыстка пачала праводзіцца неарганізавана і былі выпадкі, калі яна аводзілася кавалерыйскімі паскокамі. ра дзу вызначалася маса аб'ектаў, нараваны ўдарным парадкам брыгады асамі ў якіх-небудзь 10-12 дзён кампані чыстку такой арганізацыі, як, напрыклад, Маскоўская пракуратура. Пасля пастановы Цэнтральнага Камітэту ЦКК (12 верасьня 1929 году) чыстка чала праходзіць больш арганізавана. Паводле тых даных, якія мы маем. ацнута ў работу на чыстцы звыш о тыс. чалавек: з іх 34 проц. рабочых, ў прамысловых раёнах, напрыклад, Украіне, у камісіі ўцягнута да 60 роц. рабочых, на Урале — 54,5 проц. рабочых, сялян у гэтых камісіях зьсьлічае каля 23 проц. Апрача таго, ырока была быў мабілізаваны друк, абліза ў першыя месяцы чысткі. За ошні час гэта ўвага паслабла і тут эба будзе становішча паправіць.

Які мы маем сацыяльны склад нага савецкага апарату? Паводле даых ЦСУ ў кіраўнічым апараце па ССР налічвецца 825 тысяч чалавек, а часу XV зьезду, наколькі я памяю, было крыху больш мільёна. Гэта эба працаўнікоў апарату каштавала аіне больш чым 2 мільярды рублёў. раўнічы апарат па СССР зараз складае 825 тыс. чалавек. Гэта бязумоўна ніжэньне, калі гэта лічба не паменшна. І вось у гэтай масе чыноўнікаў, бочых усяго 152 тысячы, сялян 200 ыс. і выхадцаў з непрацоўных пластоў 21.000 чалавек. Мы маем да мая месца праверанымі амаль 50 проц. гэтай ульнай колькасьці людзей у кіраўнім апараце, а іменна 456 тыс. чалавек. Вычышчана з гэтае колькасьці 2 проц. — 51 тыс. чалавек. З гэтай сы вычышчаных на першую катэгорыю прыпадае — 22,5 проц., на другую катэгорыю — 41 проц., на трэцюю тэгорыю — 26,5 проц., і па-за ўсякімі тэгорыямі атрымала асобных спаньняў 9,5 проц.

У часе чысткі выявіліся цікавыя фіры, засёўныя ў нашых савецкіх апаратах, што сьведчыць аб значнай замешанасьці нашых апаратаў. Пры істцы Наркамзему РСФСР сацыяльнажых, былых людзей выявілася 28 лементаў, а зусім чужых элемэнтаў каа 9 проц., у той час, як рабочых у апаце 4,5 проц. Гэта нікуды ня варта, лі на другое дзесяцігодзьдзе існаваньдыктатуры пралетарыяту ў такім параце, як Наркамзем, які павінен мець ключнае значэньне ў справе сацыяльстычнай перабудовы нашай сельскай ..., калі там на 36 проц. апарат ладаўся з чужых нам элемэнтаў.

Станоўчым разультатам у гэтай чыстцы было тое, што гэтыя сацыяльна-чужыя элемэнты выяўлены і ад іх у значнай частцы наш савецкі апарат пазбаўлен.

Чыстка дала вялікі штуршок справе вылучэньня рабочых у дзяржаўны апарат. Калі мы па СССР да 1929 году мелі вылучэньства на 0,6 проц., то ў часе чысткі, яшчэ ня скончанай, гэты процант больш чым патроіўся, а іменна павялічыўся на 8,7 проц. у адносінах да таго, што мы мелі раней. Трэба сказаць, што гэты арух мізэрны, і гэтай справе трэба будзе аддаць яшчэ больш увагі, чым мы аддавалі да гэтага часу.

Па 10 цэнтральных установах да чысткі—вылучэнцаў было 368 рабочых, а ў часе чысткі стала 767, пасьля чысткі —1.093 чалавекі. Зараз неабходна як мага хутчэй гэтыя новыя кадры вылучэнцаў прапусьціць праз курсы, школы, каб яны маглі замацавацца ва установах, куды яны высунуты, каб замацавацца ва што-б там ні стала рабочую праслойку ў савецкім апараце.

Трэба сказаць і аб тым, што чыстка выявіла шмат бяспачынстваў у рабоце нашых савецкіх апаратаў. Гэтыя бяспачынствы мелі месца дзякуючы таму, што рабочая праслойка ў гэтых апаратах вельмі мізэрная, што ў іх засела вялікая частка старых чыноўнікаў са сваімі старымі традыцыямі, бюракратычнымі адносінамі да справы, баючыся сувязі з рабочымі масамі. Мы ў часе чысткі выкрылі такія агідныя факты, як, напрыклад, у галоўным кіраўніцтве машынабудаўніцтва рабочай брыгадай быў выяўлен сьпіс на 495 вынаходстваў, які марынаваўся каля году, пакуль чыстка ня выцягнула гэты сьпіс, які заключаў у сабе працу рабочых-вынаходцаў. Чыстка выявіла, дзякуючы ўдзелу рабочай грамадзкасьці, недапушчальныя факты цяганіны, бюракратычных, бяздушных адносін да справы, да інтарэсаў савецкай дзяржавы і гаспадаркі з боку галоўным чынам старых кадраў чыноўнікаў, галавацтва, шкодніцтва і г. д. Чыстка лішні раз падкрэсьлівае ўсю вострасьць пытаньня аб кадрах.

Рабочыя брыгады, прымаючы ўдзел у чыстцы, вывучалі ўвесь апарат, яго структуру і работу з мэтай яе перабудовы і паляпшэньня. У выніку такога падыходу ў радзе наркаматаў, мы маем значнае скарачэньне штатаў, вымену структуры, якая ідзе на лініі спрашчэньня і большага набліжэньня гэтых органаў да мас.

Адным з вялікіх дасягненьняў у ходзе чысткі зьяўляецца выяўленьне новых форм арганізацыі пралетарскай грамадзкасьці ў справе паляпшэньня дзяржапарату. Я маю на ўвазе пэфства прадпрыемстваў пад тымі ці іншымі ўстановамі. У гэтых адносінах ужо ёсьць узоры надавычай каштоўныя, якія гавораць аб тым, што гэту форму сувязі рабочых з савецкімі ўстановамі трэба замацаваць і разьвіваць.

У далейшым нам трэба замацаваць вынікі чысткі, ад кампаніі перайсьці да сыстэматычнай работы на паляпшэньні дзяржапарату, яго патаненьні, зьніжэньні выдаткаў, яшчэ больш шырока працягваць в дня ў дзень, уцягваць у гэту работу рабочыя масы.

Яшчэ адно пытаньне, якое перад намі стаіць у галіне дзяржаўнага апарату, гэта пытаньне аб скарачэньні штату, якое ні ў якім разе нельга лічыць

*) Канец. Пачатак гл. на 2-й старонцы.

VIII. Аб рабоце бюро скаргаў

Я вельмі коратка скажу аб рабоце бюро скаргаў. Бюро скаргаў разьвіло вельмі вялікую работу. За гэты пэрыяд бюро скаргаў пырока ўжывала мэтады прыцягненьня мас да ўдзелу ў рабоце РСІ па добраахвотных начатках. За аб'яднаным бюро скаргаў замацавана 1.100 чалавек, заклік 1928 году даў 4.000 чалавек. Бюро скаргаў будуе сваю работу такім чынам, што яно захоўвае пастаянную сувязь з прадпрыемствамі. Да найбольш буйных прадпрыемстваў прымацоўваюцца інспэктары бюро скаргаў, а з групы рабочых - добраахвотнікаў стварэцца пастаянна дзейная група. Гэта дае магчымасьць весьці арганізаваную работу па расьсьледваньні шматлікіх скаргаў, якія атрымліваюцца ў бюро.

Калі прасачыць толькі па лічбовых даных, мы маем такі малюнак: пісьмовых скаргаў паступіла ў 1927 годзе 4.000, у 1928 годзе — да 20 тыс., у 1929 — да 43 тыс., гэта значыць, за два гады лік пісьмовых скаргаў павялічыўся больш, чым у 10 раз. Так званыя вусныя скаргі таксама павялічыліся з 4 тысяч у 1927 годзе да 31 тыс. у 1929 годзе. У апошні час у групе наведвальнікаў бюро скаргаў пачынае вылучацца група беспартыйных рабочых, якія прыходзяць у бюро скаргаў не для таго, каб проста скардзіцца, а для таго, каб сыгналізаваць, падзяліцца сваёй трывогай з прычыны таго, што зрываецца ў іх прамфінплян, што, па іх думцы, дарэмна выпісваюцца тыя ці іншыя дэталі з-за мяжы ў той час, калі іх можна зрабіць самім на тым ці іншым заводзе і г. д. Такія наведвальнікі характэрны за апошні час. За самы апошні час зьявілася новая катэгорыя наведвальнікаў са скаргамі — гэта ў сувязі з «левымі» загібамі пры калгасным будаўніцтве. Як агульнае правіла, бюро скаргаў імкнецца забясьпечыць у сваёй работе такія тэмпы, каб скаргі разьбіраліся хутка. Але я скажу, што гэта не заўсёды ўдаецца. У мяне ёсьць сьпіс спраў, па якіх бюро скаргаў месяцамі ня можа дабіцца адказу з месц, куды пасылаюцца запытаньні бюро скаргаў.

IX. Заключэньне

Падагульваючы вынікі за справаздачны пэрыяд, дзейнасьць ЦКК-РСІ была накіравана на выкананьне пастаноў партыі на справе. У цэнтры ўвагі стаяла барацьба за адзінства нашай партыі, барацьба за генэральную лінію партыі, барацьба са скажэньнямі лініі нашай партыі, барацьба супроць апартунізму, барацьба на два фронты. Інакш быць ня можа. Барацьба праводзілася супроць правага ўхілу, у адносінах да якога мы абмежваны рамкамі ідэалёгічнай барацьбы, тым больш рашуча накіроўваючы на правы апартунізм, на правую практыку нашы ўдары. У вас, на Беларусі, гэтай правай практыкі ў паасобных зьвеньнях было нямала, аб гэтым напэўна будзе расказана пры справаздачы ЦКК КП(б)Б. ЦКК незьмянна дапамагала мясцовым кантрольным арганізацыям у барацьбе з апартунізмам на практыцы. Не адзін і ня два дзесяткі раз ЦКК пасылала сваіх членаў, свае камісіі на месцы каб з дапамогай мясцовых кантрольных арганізацый, а часамі і бяз іх дапамогі, там, дзе прыходзілася гэтыя кантрольныя камісіі распускаць за няправільную лінію, каб на месцы ўжыць меры да выкананьня скажэньняў лініі партыі і яе выпраўленьня.

Я, на вялікі жаль, ня змог ахапіць усёй работы ЦКК-РСІ. Прапусьціць такія важныя разьдзелы работы, як транспарт (усе віды), у галіне якога ЦКК-РСІ правяла вялізарную работу, галіну таваразвароту, каапэрацыі, справы спрашчэньня і паляпшэньня справаздачы, барацьбы з шматлікасьцю кантролю і г. д., і г. д.

У цэнтры ўвагі ЦКК УсеКП(б) былі пытаньні пяцігодкі, былі пытаньні барацьбы за тэмпы індустрыялізацыі. Зараз ужо лёзунг аб пяцігодцы невыстарчальны. Вельмі характэрна, што за гэты лёзунг у апошні час пачынаюць чапляцца правыя, яны пачалі за гэты лёзунг чапляцца імённа тады, калі пралетарыят надрыхтаваны да новага разгону, калі ён ужо мабілізаваў свае сілы на перавыкананьне прамфінпляну, на скарачэньне тэрмінаў рэалізацыі пяцігодкі — пяцігодка за чатыры гады — вось лёзунг, на аснове якога мабілізаваны і мабілізуюцца мільённыя пралетарскія масы. Адсюль бязумоўна напружаныя тэмпы работы і ЦКК у сваёй практычнай рабоце інша імённа на гэтай лініі, па лініі дапамогі нашай партыі, у стварэньні ўмоў, пры якіх магчы-б поўнасьцю ажыцьцявіцца гэтыя напружаныя тэмпы. Для стварэньня ўмоў, якія забясьпечылі-б нам выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, ЦКК у сваёй рабоце ставіла абавязковай сваёй задачай магчымая шчыльней, магчыма шырэй уцягнуць пралетарскія масы ў справу паляпшэньня як нашага гаспадарчага будаўніцтва, так і ў справу паляпшэньня работы нашага дзяржаўнага апарату, набліжаючы яго да мас, у справе барацьбы з бюракратызмам, у справе шырокага разгортваньня ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, сапраўднай бальшавіцкай самакрытыкі.

У заключэньне можна сказаць, мы прыходзім да 16 зьезду ў ідэалёгічных адносінах больш здаровымі, ачысьціўшыся ад элемэнтаў нягоднага, ад элемэнтаў, якія маглі-б партыю з сярэдзіны дэзарганізаваць, якія маглі-б служыць пунктам апоры для ўсіх антыпартыйных уплываў. Наша партыя ўзмацнеўшая, вырасшая і колькасна і якасна, маналітная, адзіная, згуртаваная на аснове вялікага вучэньня Маркса і Леніна, загартаваная ў барацьбе на два фронты, супроць правага ўхілу —галоўнай небясьпекі — і «левых» забіўшчыкаў, «левых» апартуністых, якія ўзмацняюць правую небясьпеку, і супроць примірэнцтва да ўхілаў, партыя наша моцна зьвязаная з найшырэйшымі масамі пралетарыяту нашага Саюзу і асноўнай масай сялянства, якое паварочваецца тварам да сацыялістычнага будаўніцтва ў вёсцы, наша партыя вітаецца клясавымі бойкамі міжнароднага пралетарыяту, якія ўсё напыраюцца, партыя наша ідзе да свайго XVI зьезду ўпэўнена і спакойна, пераконаная, што труднасьці, якія стаяць на шляху вялікай сацыялістычнай будоўлі, будуць ёю, пад кіраўніцтвам свайго ленінскага ЦК, пераможаны і ў будучым з такой-жа нясумненнасьцю, з якой гэтыя труднасьці перамагаліся і да гэтага часу (бурныя воплескі).

Зьнішчым прарывы ў вытворчай практыцы студэнтаў

Да адказнасьці тых, хто зрывае справу падрыхтоўкі кадраў

Важнейшыя дырэктывы ў загоне

Прафэсыянальныя і гаспадарчыя арганізацыі не зварачаюць патрэбнай увагі на бесьперапынную вытворчую практыку. Вытворчая практыка ламае ўсьлед праграмы, набліжае студэнцтва да першага курсу вучобы да заводу, які ня студэнту-практыканту ня толькі практычныя звычкі, але мае вялікае выхаваўчае значэньне. Здавалася-б, што ўсе ужо стварылі нармальныя ўмовы для працы практыкантаў. Але да гэтага ёсьць пералому ў гэтай галіне ня было. Прыкры фактаў. На заводзе «Камунар» і «Энэргія» адбывалі практыку студэнты Менскага і Віцебскага політэхнікумаў. Вартасьць гэтай практыкі нікчэмная. Практыканты замест таго, каб вывучыць працэсы вытворчасьці, вывучыць мыцьцё рабочага, прымушаны былі толькі атрымліваць пэнсію, а рабіць нічога. Але патрабаваньне практыкантаў згодна праграмы даць ім варштаты для вучэбных мэт, разборку таго ці іншага варштату, дык яны атрымлівалі адзін адказ: «кацецеся, грошы ўсё роўна атымаеце». Такое самае становішча было на заводзе «Энэргія». Студэнтам ніяк не ўдалося зьвязаць тэорыю з практыкай. Асабліва дрэнная справа з практыкай прафшкольцаў на «Гомсельмашы». Цырэкцыя, піша прафшколец, на іх ніякай увагі не зварачае, лічацы іх «майстрамі апошняга месца». На «Гомсельмашы» працуюць 13 аршанскіх прафшкольцаў і 30 градзянскіх. Замест таго, каб працаваць па спэцыяльнасьці з мэтай паглыбленьня ведаў у гэтай галіне, практыканты скарыстоўваюцца на чорнай рабоце, а ў лепшым выпадку не па сваёй спэцыяльнасьці. Такая практыка выхоўвае толькі «прыдаткаў да машын», але не арганізатараў сацыялістычнага будаўніцтва.

Дзе-ж прычыны зрыву вытворчай практыкі? Нядбайнасьць заводакіраўніцтва, неразуменьне гэтай важнай дырэктывы—вось асноўныя прычыны.

Дырэктары «Камунара» і «Энэргіі» лічылі гэта другарадным пытаньнем, якое не патрабуе сталай дапамогі, кроўнай зацікаўленасьці. Адміністрацыя «Гомсельмашу» зусім не клапацілася аб практыцы, нават з практыкантамі і гаварыць ня хоча, бо яны «нам абрыдзелі». Белмэталятрэст згадзіўся з «адмаваньнямі» дырэктара «Камунара» і ў сваёй бюракратычнай адносіцы яшчэ дадаў: «Калі завод прадставіць свае варштаты для практыкі студэнтаў у першай зьмене, вытворчасьць гэтых варштатаў рэзка зьнізіцца». І адсюль вынік, па думцы Белмэталятрэсту і заводакіраўніцтва «Камунар», практыка зусім не патрэбна (?!!). Такі падыход да бесьперапыннай вытворчай практыкі прымае апартуністычную афарбоўку ў галіне вырашэньня праблемы кадраў.

Прафэсыянальныя арганізацыі замест таго, каб рэагаваць на такія зьявішчы, цягнуліся ў хвасьце адміністрацыі і не выкарыстоўвалі студэнтаў нават і на грамадзкай рабоце.

Праўда, былі досьць вялікія хібы з боку навучальных устаноў. Пляны складаліся габінетным шляхам, не ўзгадніваліся з заводамі, вось чаму праграмы ня былі прыстасаваны да канкрэтных умоў. З боку практыкантаў трэба лічыць недапушчальным адмаўленьне ад работы ў другіх і трэціх зьменах.

Усе гэтыя прарывы на вучастку вытворчага навучаньня павінны быць ліквідаваны. Вытворчая практыка павінна быць прадугледжана ў прамфінпляне гаспадарчых органаў, а прафорганы павінны ўключыць у сваю работу ня толькі кіраўніцтва грамадзкай работай студэнтаў-практыкантаў, але і кантроль над вытворчым навучаньнем.

Ляўковіч.

Забясьпечыць Гомсельмаш матар'яламі!

Сельмашу не хапае 8-міліметравай сталі

Работа на Гомсельмашы з кожным днём разгортваецца ўсё больш. Апошнія дні завод пачаў выпускаць па 14-15 сіласарэзак штодзенна. Але на заводзе не хапае 8-міліметравай сталі для нажоў да сіласарэзак. Сталь ёсьць на заводзе ім. Ланцуцкага. Намесьнік дырэктара апошняга абяцаў Сельмашу даць 5 тон сталі са сваіх запасаў і паколькі сталь заводу ім. Ланцуцкага—12-міліметровая, ён абяцаў адкаваць 2 тоны патрэбнага Сельмашу разьмеру. Але тут умяшаўся дырэктар заводу імя Ланцуцкага т. ХІМАКОЎ, які адмовіўся выкаваць абяцаньне свайго намесьніка.

Сталь таксама ёсьць у гомельскай цагельні ім. Дзяржынскага. Гэтай сталью выслана дарога, каб палегчыць возку гліны тачкамі. Дырэктар заводу ім. Дзяржынскага згодзен аддаць гэту сталь, але просіць замест яе жалеза.

Пакуль ідуць гэтыя перагаворы, завод Сельмаш можа застацца без патрэбных матар'ялаў. Адпаведныя органы павінны дапамагчы Сельмашу выканаць сваё адказнае вытворчае заданьне па вырабе сіласарэзак.

Б. Зэльманаў.

Ніякія перабоі Сельмашу не пагражаюць

Адносна заметкі нашага рабкора аб затрудненьнях Гомсельмашу мы зьвярнуліся да дырэктара Мэталяаб'яднаньня т. Фіша па тлумачэньні. Тав. Фіш нам заявіў наступнае:

Па-першае, ніякіх паведамленьняў аб нястачы сталі Мэталяаб'яднаньне ад заводакіраўніцтва Гомсельмашу не атрымлівала і, па-другое, нястача сталі, калі-б, нават, яна і была, не прыпыніла-б работы Сельмашу, бо пажы можна прышрубаваць і пазьней, нас ля зборкі сіласарэзак.

Усё-ж, улічваючы магчымую нястачу сталі, Белмэталяаб'яднаньне ўчора дало загад заводу імя Ланцуцкаг адкаваць патрэбную колькасьць сталі для Сельмашу. Запасы сталі ёсьць і ў Менску, такім чынам, ніякіх перабоі Сельмашу не пагражаюць.

Акрамя таго, Саюзсельмаш паслаў свайго супрацоўніка ў Ніжні-Ноўгарад для закупкі гатовых нажоў для сіласарэзак.

Выкананьне вытворчага заданьня Гомсельмашам, паводле слоў т. Фіша, будзе поўнасьцю забясьпечана патрэбнымі матар'яламі.

Падрыхтавацца да рэалізацыі пазыкі „пяцігодка за чатыры гады"

БОЛЬШ УВАГІ КАМІСІЯМ САДЗЕЙНАСЬЦІ

Камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту на прадпрыемствах і ва ўстановах набываюць зараз вялікае значэньне. Ад іх работы ва многім залежыць посьпех дзяржаўнага крэдыту і кампаніі разьмяшэньня пазыкі. Трэба ўжо адмовіцца ад думкі, што камісіі садзейнасьці працуюць толькі ад кампаніі да кампаніі. На іх ускладаецца вялікі абавязак дапамагаць рэалізацыі пазык, папуляризаваць іх, камісіі павінны быць узмоцнены добрымі працаўнікамі, якія маглі-б разгарнуць вялікую работу.

Дагэтуль многія камісіі не праводзілі пастаяннай агітацыйна-масавай работы. Мала ўвагі зварачалі яны на абслугоўваньне пазыка-трымальнікаў. Амаль што нідзе ня было куткоў дзяржкрэдыту і ашчаднай справы. У выніку пазыка-трымальнікі не атрымалі выйгрышаў на суму 46 млн. руб. Яшчэ горш, чым гарадзкія, працуюць вясковыя камісіі садзейнасьці, між тым на вёсцы непачаты край работы.

Зараз, калі да пачатку рэалізацыі новай пазыкі «Пяцігодка за чатыры гады» засталося вельмі мала часу, трэба мабілізаваць увагу грамадзкасьці вакол работы камісій садзейнасьці. Трэба памятаць, што на камісіі ўскладаюцца адказныя задачы—выдача дазволаў на продаж і заклад аблігацый, шырокае абслугоўваньне пазыка-трымальнікаў і падрыхтоўка да рэалізацыі новай пазыкі.

Склад камісій павінен быць зараз перагледжан. Трэба разгарнуць шырокае сацспаборніцтва паміж асобнымі камісіямі садзейнасьці на лепшае абслугоўваньне кампаніі рэалізацыі пазык і асобных пазыка-трымальнікаў.

Пад пагрозай зрыву

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Кампанія рэалізацыі пазык сярод сэзоньнікаў на Віцебску праходзіць надзвычай дрэнна. Нарада пры саюзе будаўнікоў адзначала поўную бязьдзейнасьць камісій садзейства дзяржкрэдыту пры будаўнічых арганізацыях. Рабачкомы будаўнікоў аддаюць мала ўвагі рабоце камісій садзейства. Замест падпіскі на двухтыднёвы заработак, на прадпрыемствах праводзіцца падпіска на 5 руб. Пры кантрольнай лічбе ў 109.000 руб. па акрузе рэалізавана пазык толькі на 7.803.

Віцебскае аддзяленьне Дзяржбанку і акруговая ашчадная каса зусім не праводзяць ніякай работы, каб папырыць пазыкі сярод сэзонных рабочых.

А. Гурскі.

Агіднейшыя адносіны да практыкі студэнтаў

Ужо з 3-га мая г. г. мы, студэнты Горанкай сельска - гаспадарчай акадэміі, знаходзімся на «вытворчай практыцы» ў саўгасе імя «Карла Лібкнэхта» (б. Тарасаўка), які знаходзіцца за 5 кілёмэтраў ад Менску. З першых дзён нашай «практыкі» нас скарыстоўваюць на самай нікчэмнай рабоце, як напрыклад: накідаць гной і зграбаць яго, гнаць у поле жывёлу, працаваць у стайнях, гнаць на ваданой кароў і г. д.

На нашы запытаньні, каб нам паказалі, як працаваць са складанымі машынамі, трактарамі, загадчык саўгасу адказаў, што гэта немагчыма, бо студэнты зьяўляюцца «абузай для гаспадаркі».

На работу пасылаюць, зусім ня ўлічваючы, што гэта студэнты. Былі выпадкі, калі студэнта паставілі на работу, а праз паўгадзіны адправілі на чорную работу, ня ўлічваючы, што трэба студэнту паказаць, як працаваць.

Калі партыя і савецкая ўлада ставяць пытаньне аб спэцыялізацыі студэнтаў з першага курсу, і калі праблема кадраў у нас цяпер зьяўляецца галоўнай задачай, то кіраўнік гаспадаркі (Рамановіч член партыі і член бюро Заслаўскага райкому КП(б)Б гэтага і не жадае ведаць, а толькі глядзіць, як будзе «лепш для гаспадаркі». Пастановы лістападаўскага пленуму аб кадрах яго не датычаць.

Неабходна вышэйшым савецкім і партыйным органам прыняць усе крокі для зьнішчэньня гэтых агідных адносін да выкананьня важнейшай задачы — падрыхтоўкі кадраў — і даць напрамак у нашай рабоце.

С. С.

РАБОЧЫЯ—XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б

Бярэце прыклад з лепшых!

На 25 проц. узьняў прадукцыйнасьць працы калектыў імя XVI зьезду на Віцебскай панчошнай фабрыцы

1200 скрынак запалак замест 1163, паводле пляну, даюць работніцы ўпаковачнага цэху „Чырвонай Бярэзіны"

Пачын інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу Віцебскай гарбарні

Павялічылі прадукцыйнасьць працы на 25 проц.

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Рабочыя віцебскай панчошнай фабрыкі ўзмоцнена рыхтуюцца да XVI партзьезду. Нядаўна ў швэйна-кіцельным цэху быў арганізаваны ўдарны калектыў імя XVI партзьезду. **Ужо зараз калектыў павялічыў прадукцыйнасьць працы на 25 проц., замест 70 пачалі выпрацоўваць 87 дзесяткаў пар панчох.** Арганізаваны ўдарныя брыгады імя XIII і XVI партзьездаў. Лепшая частка работніц у ліку 11 чалавек падала заяву ў партыю. Выпускаюцца спэцыяльныя насьценгазэты імя XVI партыйнага зьезду.

ПАДАРУНАК УПАКОЎШЧЫЦ „ЧЫРВОНАЙ БЯРЭЗІНЫ"

На барацьбу за ліквідацыю майскіх прарываў

Фабрыка «Чырвоная Бярэзіна» за май выкапала праграму па выпуску запалак на 104,9 проц., па фанэрным цэху на 91,5 проц., па ватэрпасным на 95,5 проц. Гэтыя колькасныя паказальнікі зусім не забясьпечваюць ліквідацыю прарыву першага паўгодзьдзя.

Прадукцыйнасьць працы на аднаго рабочага за апошнюю дэкаду мая складае 1.518 скрынак супроць 1.537 за другую дэкаду.

Прадукцыйнасьць працы фанэрнага цэху зьнізілася з 8 тузінаў за другую дэкаду да 7,5 за апошнюю. Прадукцыйнасьць працы ватэрпаснага цэху —з 2,3 тузін да 1,9 на аднаго рабочага

Рабочыя энэргічна ўзяліся за ліквідацыю майскіх прарываў. За апошні час у сувязі з XIII зьездам партыі на фабрыцы ўзьнялася новая хваля вытворчага энтузіязму.

Работніцы ўпаковачнага цэху фабрыкі, напрыклад, улічваючы недавыкананьне прамфінпляну, **узялі на сябе абавязак да XVI партзьезду ліквідаваць прарыў. У якасьці падарунку XIII зьезду яны паднесьлі выпрацоўку апошніх дзён—1.200 скрынак у дзень, што перавышае колькасныя паказальнікі прамфінпляну.**

Работніцы ўпаковачнага цэху абавязаліся поўнасьцю зьнішчыць прагулы і брак.

Яны зьвярнуліся з выклікам да работніц здымачнага цэху ўступіць у сацыялістычнае спаборніцтва--узьняць прадукцыйнасьць працы, выпусьціць 2.450 скрынак у дзень.

Мацнёры скрыпачнага цэху фабрыкі «Пралетарская Перамога» абвясьцілі сябе ўдарнікамі імя XVI партзьезду **і ўзялі на сябе абавязак у мінімальны тэрмін устанавіць і выпусьціць 5 скрынак машын,** пяўхільна сачыць за сваячасовай змазкай машын, дабіцца зьніжэньня да нуля прастояў варштатаў. Мацнёры выклікалі па спаборніцтва па ашчадных адносінах да машынак мацнёраў іншых цэхаў і работніц скрыпачнага цэху.

Рух за хутчэйшае выкананьне прамфінпляну і ліквідацыю прарываў з кожным днём прымае на фабрыцы ўсё большы і большы разьмер. Сацыялістычнае спаборніцтва па фабрыцы праходзіць пад лёзунгам: «у якасьці падарунку XVI зьезду—выканаць і перавыканаць прамфінплян».

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ІНЖЫНЭРАЎ І ТЭХНІКАЎ

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Інжынэрна-тэхнічны пэрсанал віцебскай гарбарні абвясьціў сябе ўдарным імя XIII зьезду КП(б)Б. На нарадзе інжынэрна-тэхнічных прадаўнікоў выпушчаны рад канкрэтных абавязацельстваў.

ІНЖЫНЭРЫ ЗЭЛІКАЎ І МЕЖАРЫЦКІ АБАВЯЗАЛІСЯ ВЫПУСЬЦІЦЬ ЗВЫШ ПРАМФІНПЛЯНУ 10 ПАРТЫЙ ПРАДУКЦЫІ ДА 15 ЧЭРВЕНЯ.

Інжынэрна-тэхнічныя работнікі пастанавілі ўкамплектаваць цьвёрдыя штаты для кожнай зьмены і правесьці правільнае разьмеркаваньне рабочай сілы. Пры ніта 19 пунктаў абавязацельстваў. Пастаноўлена 15-га чэрвеня правесьці праверку выкананьня прынятых абавязацельстваў.

„Рухавік Рэвалюцыі" дабіўся значных посьпехаў

Мы, рабочыя, адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал і служачыя **ўдарнага заводу «Рухавік Рэвалюцыі» (Гомель),** цьвёрда праводзячы генэральную лінію нашай партыі, дабіліся значных посьпехаў у выкананьні прамфінпляну за першае паўгодзьдзе бягучага году.

Вытворчая праграма выканана на 101,42 проц., прадукцыйнасьць працы ўзьнята на 14,67 проц. замест 8 проц. паводле пляну, сабекошт зьніжаны на 3,99 проц. замест плянавых 3,76 проц., прагулы і спазьненьні зьнішчаны цалкам.

З красавіка, у зьвязку з неабходнасьцю забясьпячэньня сацыялістычнага сэктару буйныя с.-г. машынамі, наш завод па-хаду рэарганізаваў сваю вытворчасьць і наладзіў выпрацоўку дэталяй для сіласарэзак.

Наш заводзкі калектыў вылучыў патрэбную колькасьць рабочых на правядзеньне калектывізацыі, бальшавіцкай сяўбы і рамонту с-г. машын.

Аднадушна заяўляем зьезду КП(б)Б, што **і надалей аддамо ўсе свае сілы на пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва і ўзмацненьне абароназдольнасьці нашага краю.**

Зробім усё магчымае, каб выканаць якасныя паказальнікі прамфінпляну—

заяўляюць рабочыя заводу імя Ланцуцкага

Рабочыя, інжынэрна-тэхнічны пэрсанал і служачыя заводу імя Ланцуцкага, у ліку 2.000 чалавек, перадаюць сваё бальшавіцкае прывітаньне XIII зьезду КП(б)Б.

— Наш завод у першым квартале меў значны прарыў. Па паравозаборным цэху плян быў выкананы толькі на 77 проц., па вагонным цэху на 46 проц. Рабочыя і інжынэрна-тэхнічны пэрсанал напружанымі намаганьнямі да першага мая ня толькі выканалі вытворчую праграму за апошнія месяцы, але і ліквідавалі прарыў першага кварталу.

Калі ў нас у студзені на заводзе было 265 ударнікаў, дык зараз мы маем 1182 ударнікі. У НАС ЁСЬЦЬ РАД ІНШЫХ ДАСЯГНЕНЬНЯЎ, ЯКІЯ ДАВОДЗЯЦЬ ПРАВІЛЬНАСЬЦЬ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ І ДАВЕР'Е ДА ЯЕ РАБОЧАЙ КЛЯСЫ. За 6 месяцаў прынята ў партыю 200 лепшых ударнікаў. 26 інжынэраў і тэхнікаў падалі калектыўную заяву аб жаданьні ўступіць у партыю. З іх 15 ужо прынята ў рады партыі. Такім чынам, насёнеьні дзень арганізацыя КП(б)Б заводу налічвае 750 чалавек. За 6 месяцаў завод выпучыў на адказную работу 30 чалавек, паспаў на калгасную работу ў лік 25.000—20 чалавек, некалькі дзесяткаў рабочых заводу ўступілі ў калгасы і прымаюць актыўны ўдзел у калгасным будаўніцтве.

Але мы зрабілі яшчэ ня ўсё. У нас ёсьць яшчэ многа недахопаў: да гэтага часу сабекошт прадукцыі, ня гледзячы на значнае зьніжэньне ў параўнаньні з мінулым годам, яшчэ далёка адстае ад плянавых норм. Адстаем мы ад плянавых заданьняў у адносінах прастояў аб'ектаў рамонту.

Рабочыя заводу добра разумеюць значэньне, якое мае для ўсяго Савецкага Саюзу і міжнароднага пралетарыяту выкананьне прамфінпляну. Мы запэўняем ХІІІ зьезд КП(б)Б, што ў выпадку вайны мы будзем ударнікамі на фронце, як мы зьяўляемся ўдарнікамі ў барацьбе за прамфінплян.

Лепшы падарунак партыі—пастанова рабочых паравоза-зборнага і вагоннага цэхаў выпусьціць цягнік І вагон звыш пляну да XIII зьезду КП(б)Б і выканаць поўнасьцю вытворчую праграму да XVI Усесаюзнага зьезду партыі.

Мы арганізуем ударныя брыгады імя XVI Усесаюзнага і XIII Усебеларускага зьездаў партыі.

Рабочыя, інжынэрна-тэхнічны пэрсанал і служачыя запэўняюць Камуністычную партыю, што завод выкарыстае абсалютна ўсе магчымасьці, каб выканаць і якасныя паказальнікі прамфінпляну.

„Старшыня ня любіць, калі яго крытыкуюць"

Пры ЦП саюзу будаўнікоў адбылася ўсяго адна нарада, прысьвечаная перавыбарам рабачкомаў. Прысутнічалі і старшыні асобных рабачкомаў. Абгаворвалася пытаньне аб новых мэтадах праф работы і новай структуры прафапарату. Гаварылася аб значэньні перавыбараў прафарганізацый. Але наколькі ўсьвядомілі ўдзельнікі нарады ўсё абгаворанае, кажуць факты. Вось

Дырэктывы партыі аб рабоце сярод сэзоньнікаў ня выконваюцца

Сэзоньнікі абслугоўваюцца вельмі дрэнна

Дабіцца карэннага пералому

Шырокі размах будаўніцтва ў нашым Саюзе з кожным годам павялічвае армію рабочых сэзоньнікаў, якая больш за ўсё расьце за лік бяднацка - серадняцкіх пластоў вёскі. На аднэй БССР занята на будаўніцтвах сотні тысяч сэзоньнікаў. Гэтая лічба сама на сабе паказвае, якая ўвага павінна быць аддана абслугоўваньню сэзоньнікаў з боку мясцовых партыйных і прафэсыянальных арганізацый.

Сэзоньнікі павінны атрымаць за час будаўнічага сэзону рэвалюцыйную загартаванасьць, поўнасьцю ўсьвядоміць генэральную лінію нашай партыі, прайсьці школу інтэрнацыянальнага выхаваньня.

Адсюль тая вялізарнейшая роля, якую павінна адыграць настаноўка масавай палітыка - выхаваўчай работы сярод сэзоньнікаў, а таксама і бытавога абслугоўваньня іх.

Па гэтым пытаньні, яшчэ задоўга да пачатку будаўнічага сэзону, ухваліў вычарпальную пастанову сакратарыят ЦК КП(б)Б. У гэтай пастанове даны выразныя ўказаньні ўсім арганізацыям аб іх месцы ў агульнай сыстэме абслугоўваньня сэзоньнікаў. Сакратарыят шчэ тады канстатаваў, што «гаспадарныя і каапэрацыйныя арганізацыі, органы НКПрацы і прафарганізацыі слаба падрыхтаваны да свячасовага разгортваньня матар'яльнага і культурна - бытавога абслугоўваньня сэзоньнікаў». Сакратарыят ЦК у сувязі з гэтым папярэджваў, што «такія адносіны да натолькі важнага пытаньня зьяўляюцца недапушчальнымі і ставяць пад пагрозу зрыву ў цэлым радзе месц будаўнічыя і інш. работы».

Папярэджаньні не зрабілі пералому. **Да сустрэчы сэзоньнікаў мясцовыя арганізацыі не падрыхтаваліся. Сярод сэзоньнікаў не наладжана палітычна-выхаваўчая работа.** Большасьць сэзоньнікаў ня выпісвае газэт. Не наладжаны перасовачныя бібліятэкі, няма чытальняў.

У выніку — **сацспаборніцтвам ахоплены нязначныя колы сэзоньнікаў, ніякай барацьбы са шкодніцкай работай агентаў кулацтва, якія пралезьлі ў рады сэзоньнікаў, не вядзецца.**

У Менску на будаўніцтве новага корпусу фабрыкі «Кастрычнік» у інтэрнаты сэзоньнікаў ні разу не заходзілі культработнікі, затое часта там бываюць сэктанты і кулакі, якія «апрацоўваюць» сэзоньнікаў у контр - рэвалюцыйным духу. З Віцебску і Бабруйску нам паведамляюць аб тым, што з прычыны адсутнасьці якой-бы ні было палітычна - выхаваўчай работы, сярод сэзоньнікаў пашырылася гульня ў карты, п'янства і інш.

На лепш і з матар'яльна - бытавым становішчам сэзоньнікаў.

Ня выконваюцца дырэктывы аб ахове працы і забесьпячэньні прадуктамі сэзоньнікаў. Не наладжана і жыльлёвая справа.

На нарадзе членаў ЦК саюзу будаўнікоў, рабачкомаў і розных будаўнічых арганізацый, якая гэтымі днямі адбылася пры Фрунзаўскім РК, выявілася, што МЦРК дрэнна паладзіў забесьпячэньне сэзоньнікаў прадуктамі, што ён нядбайна аднёсься да гэтай важнейшай справы.

Зусім ігнаруецца дырэктыва аб дапамозе саюзу будаўнікоў з боку тых саюзаў для чыіх прадпрыемстваў вядзецца будаўніцтва. Мясцовыя парт'ячэйкі не дааценьваюць работы сярод сэзоньнікаў. Характэрны адказ даў сакратар парткалектыву фабрыкі «Кастрычнік» на запытаньне аб выкананай рабоце фабрычнымі арганізацыямі сярод сэзоньнікаў, якія вядуць будаўніцтва для фабрыкі:

— Якое дачыненьне мы маем да сэзоньнікаў. Мы сярод іх не вядзем работы і ня зьбіраемся весьці.

Неабходна дабіцца карэннага пералому ў рабоце па абслугоўваньні сэзоньнікаў. Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі павінны гэтай рабоце аддаць максімум увагі.

Трэба шырока разгарнуць масавую палітычна - выхаваўчую работу сярод сэзоньнікаў, каб сапраўды выхаваць з іх змагароў за калектывізацыю вёскі і ліквідацыю кулацтва, за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, за сацспаборніцтва, за зьніжэньне сабекошту будаўніцтва і г. д. Трэба выгнаць з будаўніцтва клясавых ворагаў - кулакоў, якія дэзарганізуюць рады сэзоньнікаў. Трэба дабіцца выкананьня дырэктыў аб належнай настаноўцы тэхнікі бясьпекі, рэгулярнага воднуску прадуктаў, наладжаньня грамадзкага харчаваньня, мэдабслугоўваньня, забесьпячэньня жыльлём і інш.

Тых, хто ігнаруе работу сярод сэзоньнікаў неабходна зьнімаць з работы, як за парушэньні важнейшых дырэктыў партыі і ўраду.

9.000 сэзоньнікаў--па-за ўвагай партыйных і прафэсыянальных арганізацый

Пры абсьледваньні культурна - бытавых умоў абслугоўваньня сэзоньнікаў будаўнікоў на Віцебчыне выявілася, што як гаспадарчыя і каапэрацыйныя арганізацыі, так і інспэкцыя працы і саюз будаўнікоў дрэнна падрыхтаваліся да прыёму сэзоньнікаў. Дырэктывы ЦК ВАК КП(б)Б па гэтым пытаньні да гэтага часу ня выкананы. Між тым, армія сэзоньнікаў налічвае на Віцебскай акрузе каля 6.000 чалавек, а ўсяго занята на будаўнічых работах — 9.000. Праграма будаўніцтва разгорнута па акрузе на 24 млн. руб.

Сыстэма работ на набудовах Камунгаддзелу, Віцпрамтэсту і Белдзяржбуду настаўлена вельмі дрэнна. Рабочым не растлумачаны расцэнкі, няправільна скарыстоўваецца рабочая сіла на паасобных работах. Усё гэта спрыяе цякучасьці рабочай сілы. **Вытворчы плян нават там, дзе працуе пераважная большасьць сэзоньнікаў — да рабочых не даведзен. Вытворчыя нарады скліканцца рэдка.**

На цагельнях Віцебскага прамтэсту толькі 20 проц. рабочых забясьпечваецца сяньнікамі, адсутнічаюць сталы, прадуктовыя шафы. Памяшканьне трымаецца брудна. Ня ўсюды яшчэ ёсьць піцьцевыя пункты. На работах 17-ці вучасткаў адсутнічаюць аптэчкі. Сэзоньнікі і дагэтуль не прайшлі мэдыцынскага абсьледваньня.

Асабліва дрэнна з забесьпячэньнем харчамі. Усяго адкрыта 17 ларкоў і 11 сталовак для больш буйных пабудоў. Развозка гарачага харчу для рабочых дробных пабудоў не арганізавана. Забесьпячэньне рабочых прадуктамі непастрачальнае.

Не праводзіцца ніякай культ - выхаваўчай работы. Былі падрыхтаваны прафработнікі для абслугоўваньня пабудоў, але яны перакінуты на другую работу. Усяго ёсьць 17 гуртковоў, якія ахапляюць 149 чалавек. Газэт і перасоўных бібліятэк у большасьці інтэрнатаў няма. Калектыўныя чыткі і гутаркі не праводзяцца. Нават асноўныя мерапрыемствы партыі і савецкай улады не растлумачаны сэзоньнікам. Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі не перабудавалі сваёй работы пад лёзунгам «тварам да вытворчасьці». Асноўныя масы сэзоньнікаў не ахоплены сацспаборніцтвам. Ва ўдарных брыгадах усяго 755 чалавек, і то галоўным чынам гарадзкія рабочыя.

Дырэктывы ЦСПСБ і АПБ усім саюзам аб аказаньні дапамогі саюзу будаўнікоў ня выконваюцца.

Усе гэтыя недахопы, ва ўмовах шырокага разгортваньня будаўніцтва (у параўнаньні з мінулым годам у два разы больш) патрабуюць неадкладнай мабілізацыі ўвагі партыйных і прафэсыянальных арганізацый, усёй рабочай грамадзкасьці.

ЖЫТЭЛЬЗЭЙФ.

Віцебск.

Дзе зусім няма культработы

У інтэрнаце пры пабудове 4-хпавярховага дому камуны ў Бабруйску знаходзіцца каля 160 сэзоньнікаў. Калі гэтыя сэзоньнікі прыбылі на набудову, саюз будаўнікоў не палічыў патрэбным наладзіць сярод іх растлумачальную работу, а аб тым, што яны павінны рабіць — «гэта справа адміністрацыі». Апошняя-ж не адставала ад прафсаюзу — таксама нічога не зрабіла. З вялікімі труднасьцямі мясцовым працаўніком удалося адшукаць прадстаўніка саюзу і адміністрацыі, пры ўдзеле якіх была праведзена з сэзоньнікамі гутарка.

Далей, замест ударных тэмпаў у разгортваньні культработы паступіла палаца дылетантычных перагавораў паміж незавымі прафпрапаўнікамі і саюзам. Тры тыдні прайшло пакуль арганізавалі бібліятэчку. Столькі-ж прайшло часу, пакуль знайшлі бібліятэкара. У выніку адсутнасьці ўсякай работы, сярод сэзоньнікаў разьвілася карцёжная гульня.

Толькі ў апошнія дні саюз прыслаў у інтэрнат культпрацаўніка.

З ліку шэфствуючых над сэзоньнікамі прафсаюзаў толькі адзін саюз мэдсанпрацы праводзіць работу, арганізоўваючы сярод сэзоньнікаў гутаркі, даклады на санітарна - гігіенічныя тэмы. Саюзы-ж працасьветы і саўгандальслужачых ніякай работы не праводзяць, ня гледзячы на заключаны з ЦК будаўнікоў дагавор. Сэзоньнікам патрэбна большая ўвага

АЛЬФА.

З такім становішчам нельга прымірыцца

Звыш паўтары тысячы сэзонных рабочых працуюць на заводах і набудове новых цагелень у Менску. Сярод гэтых сэзоньнікаў ёсьць батракі, беднякі, сераднякі, ёсьць і кулацкія элементы, нават не малы процант сэктантаў, якія вядуць агітацыю сярод сэзоньнікаў.

Заводзкія арганізацыі цагелень амаль ніякай работы ў казармах сэзоньнікаў не вядуць.

— Нас ня хочуць слухаць сэзоньнікі — гаворыць адзін з партыйцаў 3-га заводу тав. **Зьвейнаў.**

— Мы ня можам справіцца з усімі кампаніямі, якія праводзяцца на заводзе, а ня то, каб яшчэ і сярод сэзоньнікаў весьці работу — адказвае старшыня рабачкому 2-4 заводаў Міляшкевіч.

Сэзоньнікі-ж скарджацца на тое, што запісалі іх у гуртокі па ліквідацыі няпісьменнасьці, але з таго часу ніякіх «ліквідатараў» ня бачылі. Вольны час яны праводзяць за картамі, п'юць дэнатурат. А моладзь — хуліганіць.

Адсутнічае культурна - выхаваўчая работа, адсутнічае і працоўная дысцыпліна. Асабліва гэта назіраецца на 3-м заводзе. Пасьля атрыманьня зарплаты на працу ня прыходзяць або засыпшчыкі, або фармаўшчыкі. Паводле слоў дзесятніка Шоўкава, у сярэднім кожны дзень завод недавырабляе 20-30 тыс. штук цэглы.

Старшыня заўкому 3-га заводу Акуліч на запытаньне, як наладжана культурнае абслугоўваньне сэзонных рабочых, адказаў: «нічога не атрымліваецца. Прабавалі перавесьці завод на бесьперапынку — не ўдалося. Сэктанты перашкаджаюць рабоце». Старшыня апусьціў рукі, знайшоўшы апраўданьне пасыўнасьці і няўменьню працаваць.

З такім становішчам работы на цагельнях ні ў якім разе нельга прымірыцца. Саюз будаўнікоў бязумоўна з задачай выхаваньня сэзоньнікаў справіцца ня здолее. Патрэбна дапамога іншых прафэсыянальных арганізацый.

АЛЕСЬ СВАБОДНЫ.

Урочышча Тучынка.

МЕНСК

Садова-агародняя гаспадарка на 10 тысяч гэкт.

Наркамгандаль дагаварыўся з аб'яднаньнем «Союзплодоовощь» аб арганізацыі на тэрыторыі БССР садова-гародняй гаспадаркі з падсобнай малочнай гаспадаркай на 10.000 гэктараў. Пры гаспадарцы мяркуецца пабудаваць прад прыемствы па пераапрацоўцы садавіны і гародніны. На арганізацыю гэтай справы намячаецца водпуск на працягу двух год да 15 млн. руб. СНК БССР абавязаў Наркамзем у тэрміновым парадку вызначыць для садова-гародняй гаспадаркі патрэбныя вучасткі.

1½ МІЛ. РУБ. НА ПАДРЫХТОЎКУ КАДРАЎ

Прэзыдыум Дзяржпляну БССР зацьвердзіў водпуск па лініі ВСНГ на 1929-30 год на падрыхтоўку кадраў 1.520.000 руб. Плян прадугледжвае адкрыць 60 вячэрніх курсаў па прафтэхасьвеце для рабочых і моладзі, курсы дзесятнікаў-будаўнікоў, курсы па падрыхтоўцы швэйнікаў у Бабруйску, Віцебску і Гомелі, акруговыя курсы для дзесятнікаў пасазгатован і г. д.

У гэтым-жа годзе 20 інжынэраў, тэхнікаў і рабочых ударнікаў будуць пасланы для павышэньня кваліфікацыі на заводы СССР.

ВЫДАЧА ДЫЭТЫЧНЫХ ПАЙКОЎ

Праўленьне МЦРК пастанавіла выдаць у чэрвені 1.500 дыэтычных двухтыдневых пайкоў для хворых пайшчыкаў МЦРК. Талёны на пайкі выдаюцца лекавымі установамі. Прадукты па талёнах будуць выдавацца выключна ў крамах № 6, 11,16 і 21. Прадукты адпускаюцца па наступных нормах—700 грам пшанічнай мукі замест кілё хлеба (у дзень) 500 грам рысу, 500 грам манны пшанічнай і 75 грам масла. Хворыя, якім патрэбна дыэтычнае харчаваньне на больш доўгі тэрмін, атрымліваюць некалькі талёнаў. У лінеі будзе выдана 3.000 дыэтычных пайкоў.

ФУТБОЛЬНЫЯ МАТЧЫ КАМАНД АКРУГОВЫХ ГАРАДОЎ

На працягу чэрвеня ў Менску адбудуцца футбольныя матчы паміж зборнымі камандамі Менску, Віцебску, Гомелю і Полацку. З лепшых футбалістых будзе арганізавана зборная футбольная каманда БССР.

Культработа ў яўрэйскіх калгасах

Да культнарады арганізацый АЗЕТ'у

10-га чэрвеня склікаецца ўсебеларуская культнарада арганізацый «АЗЕТ» і акруговых камзетаў разам з прадстаўнікамі акркалгасасаюзаў і акруговых інспэкцый нарасьветы. Культнарада павінна распрацаваць дасканалы плян культурнага абслугоўваньня яўрэйскіх калгасаў і зямельных фондаў.

Дагэтуль дырэктывы партыі і ўраду аб паляпшэньні культурна-масавай работы ў яўрэйскіх калгасах і зямельных фондах не знайшлі належнага праламленьня на мясцох. Культмасавая работа ў яўрэйскіх калгасах пастаўлена вельмі дрэнна. Яна адстае ад агульнага тэмпу калгаснага будаўніцтва. 25 проц. яўрэяў-калгаснікаў і зямляробаў не ліквідавалі няпісьменнасьці. Дрэнна забясьпечаны яўрэйскія калгасы літаратурай на роднай мове, асабліва па пытаньнях калгаснага руху і агранамічнае асьветы.

Санітарна-гігіенічнае становішча яўрэйскіх калгасаў далёка не на вышыні. У радзе калгасаў няма лазьняў, няма студняў.

Рэдка-рэдка нападаюць у яўрэйскія калгасы кіно-перасоўкі.

Рад калгасаў зусім не абслугоўваецца дзіцячымі ўстановамі. Напрыклад, калгасы Буда-Кашалёўская, Веткаўская раёну ня маюць ні дзіцячых садоў, ні дзіцячых пляцовак. У радзе калгасаў няма лікпунктаў і хат-чытальень. Многія калектывы абслугоўваюцца ўстановамі мястэчак, якія знаходзяцца на адлегласьці 6-8 вёрст. Рабочыя прадпрыемстваў мала што зрабілі ў адносінах культурнага шэфства над яўрэйскімі калгасамі.

Наогул культурнае абслугоўваньне яўрэйскіх калгасаў і зямельных фондаў праводзілася бяз плану і сыстэмы. Ня было разьмежаваньня паміж органамі асьветы, АЗЕТ'у і КАМзет'у.

Культурная нарада павінна высьветліць слабыя месцы ў культабслугоўваньні яўрэйскіх калгасаў, накіраваць максімум сіл і ўвагі на гэтыя месцы, дабіцца паляпшэньня культурнай работы.

КАЖДАН.

100 РАХУНКАВОДАЎ У КАЛГАСЫ

Белкалгасцэнтр накіраваў на пастаянную работу ў калгасы БССР 100 рахункаводаў, якія скончылі ў Менску 3-хмесячныя курсы. Ва ўсіх акругах адкрыліся курсы па падрыхтоўцы рахункаводаў на 250 чалавек.

ВЫСТАЎКА «10 ГОД МАСТАЦТВА БССР»

Адначасова з першай усебеларускай выстаўкай с.-г. і прамысловасьці ў Менску адкрыецца ўсебеларуская мастацкая выстаўка пад назвай: «10 год мастацтва БССР». Выстаўка адлюструе найбольш выразныя моманты гісторыі мастацтва Савецкай Беларусі.

ЭКСКУРСІЯ АБУТНІКАЎ У КІЕЎ І ХАРКАЎ

15-га чэрвеня 30 рабочых менскай абутковай фабрыкі выяжджаюць у вытворчую экскурсію ў Кіеў і Харкаў. Экскурсанты наведаюць найбольш буйныя абутковыя фабрыкі і гарбарні. Усім экскурсантам выданы ільготныя літары.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ПА ЛІКВІДАЦЫІ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ

15-га чэрвеня ў Менску адкрываецца ўсебеларуская нарада па ліквідацыі няпісьменнасьці. Нарада абгаворыць пытаньні аб выніках навучальнага году і падрыхтоўцы да будучага году. У гэтым годзе лікпунктамі і школамі для малапісьменных было ахоплена 250.000 чалавек. Працавала 10.000 лікпунктаў.

БДТ-1 НА ЎСЕСАЮЗНАЙ ТЭАТРАЛЬНАЙ АЛІМПІЯДЗЕ

13 чэрвеня БДТ-1 выяжджае ў Масву для ўдзелу ва ўсесаюзнай тэатральнай алімпіядзе. Зараз тэатр выступае ў Магілеве.

Мэліярацыйныя работы не забясьпечаны рабочай сілай

Прэзыдыум Ўсебеларускага камітэту саюзу с.-г. лес. рабочых заслухаў даклад аб ходзе мэліярацыйных работ. Прэзыдыум адзначыў, што мэліярацыйныя работы праходзяць нездавальняюча, з-за недахвату рабочай сілы. Работы забясьпечаны рабочай сілай толькі ў размеры 18 проц.

Вярбовачны апарат Наркампрацы мала што зрабіў у адносінах вярбоўкі рабочых на мэліярацыйныя работы. Рабочыя жывуць у цяжкіх жыльлёвых і бытавых умовах. Культмасавая работа на мэліярацыйных работах амаль не праводзіцца.

Прэзыдыум Ўсебеларускага камітэту прызнаў патрэбным, каб Наркампрацы свячасова выканаў дагавор з НКЗ на забясьпячэньне мэліярацыйных работ рабочай сілай. Прэзыдыум прызнаў неабходным адкрыць на работах рад каапэрацыйных сталовак, забясьпечыць мэліярацыйныя вучасткі аптэчкамі, пабудаваць баракі для рабочых - сэзоньнікаў. Перад Наркамгандлем паставлена пытаньне аб ураўненьні рабочых, занятых на мэліярацыйных работах, у адносінах забясьпячэньня прадуктамі харчаваньня да рабочых торфараспрацовак.

Крывавая бойка на кірмашы

Нядаўна ў дзень рэлігійнага сьвята «ўшэсьця» ў вёсцы Шчаўры, Халопеніцкага раёну, адбываўся вялікі кірмаш.

Паводле традыцыі, удзельнікі кірмашу перапіліся, і пачалася крывавая бойка. Міліцыянэры, якія хацелі арыштаваць хуліганаў, былі зьбіты. Толькі ўзмоцненаму нараду міліцыі ўдалося ліквідаваць бойку. У выніку забіта дзяўчына Скалубовіч і 20 чалавек цяжка паранена.

Крымшукам затрымана 8 хуліганаў, якія прыцягваюцца да судовай адказнасьці.

7 год Віцебскай арганізацыі МОПР'у

Роўна 7 год назад група таварышоў у ліку 5-ці чалавек арганізавала мопраўскую арганізацыю ў Віцебску.

З таго часу мінула 7 год, і цяпер мы можам падвесьці некаторыя вынікі работы Віцебскай арганізацыі МОПР'у.

Усяго мопраўская арганізацыя налічвае 635 ячэек з лікам каля 50 тысяч членаў: у параўнаньні з мінулым годам арганізацыя павялічылася на 15.000 чал.

Разам з работай па вярбоўцы новых членаў, галоўным чынам, за лік батрацка-бядняцкай і серадняцкай часткі вясковага насельніцтва, мопраўская арганізацыя адначасова праводзіла вялізарную работу па выхаваньні ў інтэрнацыянальным духу сваіх членаў. Амаль што на ўсіх фабрыках і заводах, у калгасах, хатах-чытальнях можна ўбачыць куткі МОПР'у, дзе капцэнтруецца ўся культ-масавая работа.

Мопраўцы Віцебшчыны актыўна дапамагаюць барацьбітом рэвалюцыі. За 1929 год і 4 месяцы г.г. усяго паслана 59 тысяч руб. Гэта сума перавышае кантрольную лічбу, якая намечана Цэнтральным Камітэтам МОПР'у (сюды не ўваходзіць перасылка бялізны і іншых каштоўных падарункаў).

Вялізарная выхаваўчая работа праводзіцца сярод моладзі. Ва ўсіх працоўных школах і піянэр-атрадах арганізаваны таварыствы юных прыхільнікаў МОПР'у, якія прымаюць актыўны ўдзел у штодзённай рабоце МОПР'у. За лепшую пастаноўку выхаваўчай работы Цэнтральны Камітэт прэміяваў Старасельскую ячэйку МОПР'у.

З вялікім энтузіязмам праводзілі ячэйкі МОПР'у збор утыль-сыр'ю, залатых і срэбных рэчаў у карысьць індустрыялізацыі нашай краіны.

У часе загатовак бульбы сабрана членамі МОПР'у 3.600 мяшкоў.

Дзень калектывізацыі таксама не прайшоў міма мопрарганізацыі. Акруговым Камітэтам і пізавымі ячэйкамі былі пасланы на вёскі брыгады, якія ўвязвалі пытаньне калектывізацыі з міжнародным рэвалюцыйным рухам.

Акруговым Камітэтам МОПР'у быў закуплен трыер, які атысьціў больш 3.000 пуд. насеньня. Ва многіх раёнах працавалі брыгады па зборы попелу. У Віцебскім раёне у вёсцы Федраўка сіламі МОПР'у арганізаваны калгас імя МОПР'у. Гэты калгас мае 1.354 гэкт. зямлі.

У гэты калгас увайшло ўсё працоўнае насельніцтва паўкольных вёсак. У іншых раёнах арганізаваны калгасы імя Ланцуцкага і Парыскай Камуны.

Апрача гэтага ва ўсіх раёнах мопраўцамі засялена 150 мопраўскіх палосак, увесь ураджай з якіх пойдзе на дапамогу палітзьняволеным.

Ячэйкам МОПР'у трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на арганізацыю мопраўскіх ударных брыгад на заводах і фабрыках, бо актыўны ўдзел МОПР'у ў сац. будаўніцтве—ёсьць найлепшая дапамога барацьбітом рэвалюцыі.

С. Брайнін.

Навіны тэатру

— Гэтымі днямі скончыўся **конкурс на лепшы масавы сьпеў.** Конкурс быў абвешчан Галоўмастацтвам БССР. на конкурс паступіла 7 сьпеваў. Журы конкурсу пастанавіла прэміяваць трэцім прэміямі сьпевы **Ю. Лявонага—«Зважай, камсамол!» і Я. Івашына—«Пяцігодка».** У куткім часе сьпевы будуць пераложаны на музыку.

— НКА зацьвердзіў склад **журы конкурсу на оперное лібрата.** У склад журы ўваходзяць 9 чалавек-прадстаўнікоў: галоўмастацтва, мэтэхнікуму, ЦСПСБ, БАН і Белан'у.

— Галоўмастацтва ўзьняло пытаньне аб **устанаўленьні пераходнага чырвонага сьцягу для тэатраў,** якія найлепш абслужаць рабочага гледача.

— У гэтым годзе буде з арганізавана **першая ў БССР група артыстых эстрады,** якая абслужыць рабочыя клюбы, калгасы і саўгасы.

Да ведама падпісчыку „Зьвязды"

З сёньняшнім нумарам газэты „Зьвязда" рассылаецца дармовы дадатак— **ГАЗЭТА „ПРАФРУХ" № 14**

Падпісчыкі! Пры атрыманьні «Зьвязды» патрабуйце дадатак „ПРАФРУХ"

Акадэмік П. А. ТУТКОЎСКІ

У Кіеве, на 72 годзе свайго жыцьця памёр вядомы геолёг, член Усесаюзнай і Беларускай Акадэміі Навук, **Павел Апалонавіч Туткоўскі.**

Акадэмік П. А. Туткоўскі нарадзіў 1 сакавіка 1858 г. у м. Ліпаўнах па Кіеўшчыне.

Займаючы пасаду выкладчыка прародазнаўства і геаграфіі ў Кіеве, а потым на Вальні, П. А. Туткоўскі ўвесь вольны час аддаваў на вывучэньне геолёгіі і геаграфіі гэтай, мала вядомай тады крыны — Украінскага Палесься.

У 1911 г. П. А. Туткоўскі абараніў пры Маскоўскім Унівэрсытэце першую сваю вядомую дысэртацыю: «Выкашываньня пустыні наўночнай паўкулі», якую і атрымаў годнасьць «доктара геаграфіі». З гэтага часу імя яго робіцца шырока вядомым і набывае вялікі аўторытэт у пытаньнях геамарфалёгіі і геолёгіі.

Імя П. А. Туткоўскага цесна зьвязана з першым сыстэматычным вывучэньнем геолёгіі Беларусі, і яго кніга «Геологический очерк Минской губ.», зьяўляецца і да нашага часу прыкладам і мэтадам дасканалага і надзвычай уважлівага геолёгічнага апісаньня.

У кароткім дэкрэлёгу немагчыма ацаніць усіх прац П. А. Туткоўскага і тых пытаньняў, якія ставіў ён перад геолёгічнай навукай.

У асобе Туткоўскага Савецкі Саюз страціў выдатнага вучонага.

Забесьпячэньне плытагокаў не наладжана

Абслугоўваньне плытагонаў, ня гадзячы на шматлікія дырэктывы з боку каапэрацыйных арганізацый, дагэтуль мала паляпшылася.

Рабочым лесасплаву прыходзіцца часта пераплачваць за тавары. Так, напрыклад, плытагоны плацяць 33 р. за пару ботаў, якія на фактуры Белкаасаюзу каштуюць 23 р. 50 кап. Мука жыта найпайшчыкам прадаецца па 2 р. 5 к., плытагонам Вягомльскага раёну—по 3 р. 60 к.

У **Аршанскай акрузе** няма ніякіх фондаў для забесьпячэньня возчыкаў лесу.

У **Магілеўскай акрузе** наглядаюцца вялікія перабоі з выдачай прадуктаў. Выяўлены выпадкі выдачы недобраякасных прадуктаў. На месцох сілы не хапае дзёгцю і вораны, што адмечаецца на свячасовым выкананьні заданьня.

У **Гомельскай акрузе** 200 рабочых плытагонаў на працягу двух дзён не атрымалі печанага хлеба, ня гледзячы на тое, што ў цякарні Гомельскага сельскага спажывецкага т-ва ў гэты час было 1000 кілё хлеба. Асабліва дрэнна абстаіць справа з забесьпячэньнем рабочых плытагонаў у **Полацкай** акрузе.

Праўленьне Белкаасаюзу ведала аб казённых адносінах мясцовых працаўнікоў да абслугоўваньня плытагонаў, але нічога ня робіць, каб наладзіць забесьпячэньне.

Трэба паладзіць паказальныя працэсы над бюракратамі, якія зрываюць сплаўную кампанію, і дабіцца паляпшэньня абслугоўваньня сплаўшчыкаў.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

Дом Камасьветы. У пак. № 3 заняткі гуртка ангельскай мовы. Пач. а 6-й вечар.

— У сувязі з перавучэньнем бібліятэкі дому—просьба да ўсіх чытачоў вярнуць узятыя кнігі.

БДУ. У 41 аўдыт. (стары будынак) адбудзецца адчынены сход яч. КП(б)Б ф-ту саўбуд і права. У парадку дня: Даклад аб становішчы і дзейнасьці фак. саўбудаўніцтва і права—даклад т. Ракава. На сход запрош. т. т. Хацкевіч (ЦВК), Рыўлін (НКА), і Міхайлаў (НКЮ). Яўка партыйцаў і камсамольцаў абавязкова. Запрашаюцца ўсе студэнты і навуковыя працаўнікі. Пач. а 7-й гадзіне веч.

Сад Асьветы. Кіно—дзьве камедыі ў адзін сэанс: 1) «Пат арыстократ» і 2) «Цікая сямейка». Пач. а 9 г. 30 м. веч.

ЗАЎТРА

Мэдсэкцыя Белтарнітса зьбіраецца а 7-й г. веч. у дэканаце мэдфаку.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Летні Тэатр „ПРАФІНТЭРН"

Перасовачны мастацкі тэатр «КРАСНЫЙ ФАКЕЛ»

НЯДЗЕЛЯ, 8 ЧЭРВЕНЯ ДЛЯ ЧЛЕНАЎ ПРАФСАЮЗАЎ

„На всякого мудреца довольно простоты"

Намэдыя

— Білеты ў раб. касе Пачатак а 8 гадз. 30 м. —

У панядзелак, 9-га чэрвеня для членаў саюзу саўгандальслужачых

— пойдзе п'еса —

„ЧЕЛОВЕК С ПОРТФЕЛЕМ"

Білеты ў канцылярыі клюбу Саўгандальслуж. ад 6 да 9 г. увеч.

КІНО Інтэрнацыянал — Мастацкая кіно-аповесьць ВЕЦЕР у ТВАР. Пачатак 1-га сэансу а 7 г. Каса—ад 5 г.

Звыш праграмы кіно-штомесячнік Белдзяржкіно „Беларусь Савецкая" № 6, прысьвечаны XIII зьезду КП(б)Б.

У нумары: 1. Менская акруговая партканфэрэнцыя. 2. Адчыненьне XIII зьезду КП(б)Б. 3. Асінбуд. 4. Зорныя вялёсыпадныя прабегі. 5. Унівэрс. гарадок. 6. 25-гадовы юбілей літаратурнай дзейнасьці Яні Купалы. 7. Масавая экскурсія на Днепрабуд.

КІНО САД (Савецкая, 71) — Нямецкі фільм Паводдя навалі СТЭФАНА ЦВЭЙГА. СТРАХ. драма ў 8 частках. Пачатак 1-га сэансу а 9 г., 2-га 10 г. 30 м. Каса з 6 гадз.

КІНО Пралетары — 2-гі ТЫДЗЕНЬ ТРУКАВЫ КІНО-РАМАН МІС МЭНД. 2 сэрыі—11 частак у адзін сэанс. У галоўнай ролі Ігар Ільінскі. Пачатак 1 сэансу а 7 гадз. — Каса з 5 гадз.

1-ны дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр" — Мастацкі фільм у 2-х сэрыях—12 частках. „КРАСНЫЕ ДЬЯВОЛЯТА" Абедзьве сэрыі ў адзін сэанс. Пачатак 1 сэансу з 2-х гадз. Каса з 12 г.

КІНО СПАРТАК — НЯМЕЦКІ ФІЛЬМ ВІНАВАТЫ (СУДОВЯ ПАМЫЛКА). У галоўнай ролі Бэрнгард Гэтцке. Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. КАСА—АД 6 Г. 30 М.

50 К. кошт 1 публікацыі аб згубе дакумента

Менск, Галоўлітбел № 337.

ВЫХОДЗІЦЬ З ДРУКУ І РАССЫЛАЕЦЦА УСІМ ПАДПІСЧЫКАМ

№ 8 „ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК" № 8

ЗЬМЕСТ:

ПЕРАДАВАЯ:
Да XIII зьезду КП(б)Б
На абгаварэньне да XIII зьезду КП(б)Б:
1. Прафсаюзы БССР не перабудавалі сваёй работы—Шапіра і Вашкевіч.
Па партыйных арганізацыях:
1. За лепшую пастаноўку партыйна-масавай работы—Рэвінскі.
2. Аб недахопах і прарывах А. Т.
У барацьбе за прамфінплян:
1. За рашучы пералом у рабоце чыгункі—Танхілевіч.
2. На перадавую лінію барацьбы за прамфінплян—А. Курціх.
Вопыт месц:
1. Аб рабоце вытворчых камун—Шпектараў.
2. Марудзяць з падрыхтоўкай кадраў—З. Ф.
Бібліяграфія:
1. Карысны дапаможнік—Партыец.
Афіцыйны аддзел:
1. Пастановы трэнопартнай нарады (№№ 1, 2, 3 і 4)
2. Пастанова Бюро ЦК аб рабоце Мазырскай арганізацыі.
3. Пастанова Бюро ЦК аб рабоце 2-й раённай арганізацыі КП(б)Б Віцебскае акругі.
4. Пастанова Сакратарыяту ЦК аб рабоце парткалектыву ф-кі «Чырвоная Бярэзіна».
5. Пастанова Ўсебеларускай нарады рэдактораў.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 м-ц —25 кап.	6 м-цаў—1 р. 50 кап.
3 м-цы—75 кап.	На 1 год—2 р. 75 кап.

Кошт асобнага нумару 15 кап.

ПАДПІСКУ ПРЫМАЮЦЬ: галоўная кантора газэты «Зьвязда», Бюро падпіскі Белдзяржвыдавецтва і Дзяржкумвыдавецтва РСФСР і ўсе паштовыя аддзяленьні і ліотаносцы.

ЭГУБЛЕНА ГЭРБАВАЯ ПЕЧАТКА Сямёнаўскага сельсавету, Вузьдзенскага р-ну, Мен. акр. Прошу несапраўдным.

ШУКАЮ МЕСЦА ХАТНЯЙ ПРАЦАЎНІЦЫ. УМЕЮ ГАТАВАЦЬ І МЫЦЬ БЯЛІЗНУ. Ленінская 10, кв. 15, Шапіра.

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ ў менскую 2-гадовую школу мэдычных сёстраў ЦК Чырвонага Крыжу БССР

У школу прымаюцца асобы ўзростам ад 17 да 30 год.

Скончыўшыя 7-мігодку, школу дарослых навышанага тыпу, агульна-асьветныя курсы і школу былой сялянскай моладзі на базе 4-годкі, прымаюцца бяз іспытаў.

УВАГА: у адносінах работніц, батрачак, санітарак, адукацыйны цэнз для прыёму зьніжан да 5-ігодкі.

Школа прымае ў гэтым годзе 150 асоб, месцы разьмяркованы па акруговых к-тах Чырвонага Крыжу, куды жадаючыя павінны падаваць наступныя дакументы:

1) Дакумент аб узросьце (мэтрыка);
2) » » асьвеце;
3) 2 фатаграфічныя карткі;
4) Мэдычнае насьведчаньне аб стане здароўя паступаючага;
5) Дакумент, які сьведчыць аб матар'яльным і сацыяльным становішчы паступаючага, яго бацькі да і пасьля рэвалюцыі;
6) Даведка, засьведчаная пізавой савецкай арганізацыяй, аб тым, што паступаючы і яго бацькі не пазбаўлены выбарчых праў;
7) Для сялян—акладны ліст на 1929-30 г., а для саматужнікаў—патэнт;
8) Анкету, засьведчаную прафэсыянальнымі або савецкімі арганізацыямі.

Тэрмін прыёму заяў з 1-га чэрвеня па 25-е ліпеня, пасьля чаго дакументы адабраных акругамі кандыдатур перасылаюцца ў цэнтральную адборачную камісію пры ЦК Чырвонага Крыжу БССР.

Аб выніках прыёму паведамляюцца ўсе асобы індывідуальна.

СЕКАРОВСКАЯ ЖИДКОСТЬ